ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 81 (2247)
11 кастрычніка 1968 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЕРАМОЖЦЫ СПАБОРНІЦТВА

Сёлета гандаль кнігай у сістэме спажывецкай кааперацыі рэспублікі карэнным чынам рэарганізаваны. Створана ўпраўленне кніжнага гандлю і абласныя кнігагандлі спажывецкай кааперацыі (облкаапкнігагандлі). Апошнія працуюць цяпер на гаспадарчым разліку, што значна павысіла матэрыяльную зацікаўленасць сельскіх кніжнікаў.

Упраўленню кніжнага гандлю Белкаапсаюза па выніках работы за першы і другі кварталы бягучага года ўручаны пераходны чырвоны сцяг і першая грашовая прэмія Цэнтрасаюза і ЦК прафсаюза работнікаў дзяржаўнага гандлю і спажывецкай кааперацыі.

Пераможцамі ў рэспубліканскім спаборніцтве сярод сельскіх кніжнікаў прызнаны Віцебскі аблспажыўсаюз, якому ўручана трэцяя грашовая прэмія (па выніках работы за першы квартал). У другім квартале пераходны чырвоны сцяг праўлення Белкаапсаюза і БРК прафсаюза работнікаў дзяржаўнага гандлю і спажывецкай кааперацыі і другую грашовую прэмію заваяваў Мінскі аблспажыўсаюз.

У юбілейным годзе сельскія кніжнікі рэспублікі працуюць рытмічна, з месяца ў месяц перавыконваючы планы продажу кніг насельніцтву. Сёлета за дзевяць месяцаў яны рэалізавалі рознай літаратуры, плакатаў, альбомаў на 5 207 тысяч рублёў. У параўнанні з мінулым годам гэта на 407 тысяч рублёў больш.

САМАДЗЕЙНАСЦЬ ТРЫМАЕ СПРАВАЗДАЧУ

У раёнах Мінскай вобласці пачаліся творчыя справаздачы калектываў мастацкай самадзейнасці, прысвечаныя 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. У нядзелю, 6 кастрычніка, адбыліся раённыя агляды ў Клецку, Слуцку, Мінскім раёне і Стоўбцах.

На сцэне Стаўбцоўскага раённага Дома культуры ў вялікім святочным канцэрце бралі ўдзел 20 самадзейных калектываў, звыш 800 артыстаў-аматараў. Адных харавых калектываў выступіла дзевяць. Варта адзначыць высокую выканаўчую культуру і чысціню гучання хораў калгасаў імя Леніна, «Праўда», «Чырвоная зара», «Нёман». Падрыхтаваныя імі песні «Партызанскі край» І. Кузняцова, «Табе, Беларусь» Я. Ціхановіча, «Імя Леніна» І. Троскі прагучалі на добрым мастацкім узроўні.

Значнае развіццё харавой самадзейнасці на Стаўбцоўшчыне, якое так узрадавала, тлумачыцца прыходам у сельскія ўстановы культуры людзей, якія ведаюць музыку. Сёлета, напрыклад, загадчыкамі пяці клубаў прызначаны выпускнікі курсаў баяністаў, якія працуюць пры Стаўбцоўскай дзіцячай музычнай школе. Добры плён дало таксама шэфства выкладчыкаў гэтай школы на чале з яе дырэктарам У. Тараном над сельскімі харавымі калектывамі.

На раённым аглядзе шырока было прадстаўлена мастацкае чытанне. Прыемнае ўражанне пакінулі выступленні пенсіянера калгаса «Нёман» Сцяпана Паўлавіча Жылуновіча (байка К. Крапівы «Дзве кумы»), калгасніц сельгасарцеляў імя Мічурына і «Краіны Саветаў» Л. Гардынец, Л. Івашка, Л. Глобы, калгасніка Я. Кожыча і іншых.

Цікава прагучала «Беларуская полька» ў выкананні ансамбля народных інструментаў калгаса імя Леніна.

Крыху слабей выглядала самадзейная харэаграфія. Па сутнасці, на аглядзе выступілі два танцавальныя калектывы (калгасаў «Нёман» і «1-е Мая»), ды і тыя не паказалі высокага майстэрства.

Разнастайны і змястоўны быў рэпертуар самадзейных артыстаў. Гучалі песні У. Алоўнікава, І. Кузняцова, Н. Сакалоўскага, Ю. Семяныкі, М. Шуміліна, вершы Я. Коласа, К. Крапівы, П. Броўкі, творы кампазітараў-аматараў А. Шыдлоўскага, Я. Ціхановіча, І. Троскі, мясцовых аўтараў, (напрыклад, «Вечарынка» С. Жылуновіча).

Зварот да нацыянальнага рэпертуару — адметная рыса юбілейнага агляду народных талентаў. Добры прыклад у гэтым паказваюць вядомыя ў раёне калектывы мастацкай самадзейнасці — мастацкая агітбрыгада раённага Дома культуры, тэатр эстрадных мініяцюр Міналаеўшчынскага сельскага клуба, харавыя калектывы Засульскага і Нова-Свержанскага сельскіх Дамоў культуры і інш.

Л. НЯВАРКА,
старшы інспектар Мінскага абласнога Дома народнай творчасці.

13 КАСТРЫЧНІКА — УСЕСАЮЗНЫ ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

ПАКЛОН ТАБЕ, ХЛЕБАРОБ!

ХЛЕБАРОБ. Чалавек, які робіць хлеб... Спрадвеку было ў народзе гэтае паняцце сінонімам самай цяжкой працы, самага гаротнага жыцця.

Жыве слова гэтае і сёння. Толькі вымаўляем яго мы з найвялікшым гонарам і павагай. Сённяшні хлебароб не раб — гаспадар зямлі, чалавек адной з самых пачасных прафесій.

Гэтыя чацвёра — тансама хлебаробы. І пра кожнага з іх можна сказаць шмат добрых слоў.

Вельмі паважаюць калгаснікі сельгасарцелі імя Калініна Кіраўскага раёна Васіля Якаўлевіча Котава. Пранкіў Васіль Якаўлевіч доўгае жыццё, шмат папрацаваў на сваім вяку. Цяпер ён на пенсіі. Але ў гарачыя для гаспадаркі дні заўсёды памагае аднавяскоўцам. Цэняць яны старыя, але яшчэ дужыя рукі Васіля Якаўлевіча, яго розум і вопыт.

На другім здымку вы бачыце Надзею Іванаўну Букатую — вядомую на ўсю рэспубліку свінарку калгаса «Радзіма» Капыльскага раёна. Надзежда Іванаўна сапраўдны прафесар у сваёй справе. З усіх куткоў Беларусі едуць да яе вучыцца вырошчваць свіней. За самаадданую працу Н. Букатая ўдастоена высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы.

Шырока вядома ў рэспубліцы і імя доктара сельскагаспадарчых навук, дэпутата Вярхоўнага Савета БССР прафесара Мікалая Дзмітравіча Мухіна. Гэта пад яго кіраўніцтвам быў выведзены новы высокаўраджайны гатунак жыта «Дружба».

І, нарэшце, яшчэ аб адным фотаздымку. На ім чалавек самай папулярнай цяпер прафесіі на вёсцы — ён механізатар. Ну, а пра Бернарда Станіслававіча Нядзведскага, які працуе ў калгасе «Ясная Паляна» Ашмянскага раёна, можна толькі дадаць, што гэта механізатар самага высокага класа.

Фота Ул. КАШКАНА, Л. ЗИДЗІНА і М. АМЕЛЬЧАНКІ.

ТАМ, ЛЯ ВЫШЫНІ 215,5...

ЗАЎТРА ПАД ВЁСКАЙ ЛЕНІНА, ШТО НА МАГІЛЁЎШЧЫНЕ, АДКРЫЕЦЦА МЕМАРЫЯЛЬНЫ КОМПЛЕКС, ПРЫСВЕЧАНЫ БАЯВОЙ САДРУЖНАСЦІ САВЕЦКАЙ АРМІІ І ВОЙСКА ПОЛЬСКАГА

ВЕРАСЕНЬ 1939-га года... Першыя выбухі другой сусветнай вайны ўзарвалі зямлю. Польскую зямлю!

(Дарогі Еўропы мякка шамацелі пад коламі бліскучых аўтамабіляў, яны яшчэ не ведалі жорсткасці танкавых тракаў...)

Светлыя рэкі паружавелі ад крыві першых ахвяр. Польскай крыві!

(Пройдзе некалькі год, і свет уздрыгане, даведаўшыся, колькі людзей загінула ў гэтай сусветнай бойні...)

Запалалі першыя вёскі. Польскія вёскі!

(Хутка паўсвету счарнее ад дыму пажарышч...)

Армады самалётаў з чорнымі крыжамі скідалі свой жахлівы груз на гарады. На польскія гарады!

(Гэта толькі пачатак — полымя Ковентры, руіны Сталінграда, смяротны грыб над Хірасімай яшчэ наперадзе)

Першыя кулі сусветнай вайны трапілі ў тваё сэрца, Польшча!

Свет спалохана маўчаў. На захадзе чакалі — куды далей накіруюцца гэтыя... са свастыкай на рукавах.

А яны ішлі ў сваіх чорных мундзірах, у лабастых касках, ішлі і рагаталі — з людзей, якіх яны прыйшлі забіваць, з зямлі, якую яны падзялілі паміж сабой, з арміі, што славілася лепшай у свеце кавалерыяй, але амаль не мела танкаў.

Яны збіраліся будаваць свой тысячагадовы рэйх і былі ўпэўнены, што ўжо ніколі не сустрэнуцца з салдатам, апранутым у мундзір польскай арміі.

Польшча была разбурана! Польскай арміі не існавала!

...Прайшло ўсяго чатыры гады.

Дывізію паднялі раней, чым заўсёды. Было хмурна і сыра, халодны вецер зрываў з дрэў чырвонае лісце. Салдаты, якіх пастроілі пабатальённа, употай дымілі цыгаркамі, чакалі камандзіра.

Ён нечакана з'явіўся на левым фланзе, падцягнуты, зграбны, выйшаў на сярэдзіну паляны. Агледзеў строй:

— Перад намі стаіць вялікая свяшчэнная задача, але на шляху да яе — смяртэльны вораг! Адкінем яго і пракладзём сабе дарогу ў Польшчу! Хай жыве перамога! Хай жыве Польшча! Наперад у бой!

Гэта быў загад, якога так доўга чакаў кожны з тых, хто стаяў у гэтым страі...

Наперад! Туды, дзе пакутуе і змагаецца родны народ!

Наперад! На дапамогу радзіме, якую вораг ператварыў у вялізны лагер смерці!

Наперад!

Наперад у бой!

■

Я іду праз вёску Леніна, праходжу мастом праз невялікую рачулку, потым збочваю на ўзгорак, па слізкай, размякшай пад дажджом гліне.

Дваццаць пяць год таму адгэтуль ішлі ў атаку салдаты другога палка першай пяхотнай дывізіі імя Тадэвуша Касцюшкі. Беглі, каб вунь там, дзе жаўцеюць рэдкія кусцікі хмызнякоў, залегчы пад кінжальным агнём варожых кулямётаў, пачакаць, пакуль артылерыя знішчыць варожыя агнявыя кропкі, ды зноў рынуцца наперад — бліжэй да варожых траншэй і акопаў.

Яны ішлі ў атаку так, быццам за гэтымі траншэямі пачыналася Радзіма. Кожнаму хацелася схапіцца ўрукапашную з ворагам, адпомсціць яму за ўвесь боль і гнеў, што накапіліся за доўгія чатыры гады пакут.

Напэўна яны не ўмелі добра ваяваць, бо часта адыходзілі і зноў падымаліся ў атаку. Недзе ж побач грымела рускае «ўра», ім не хацелася адставаць ад сваіх братоў па крыві і зброі.

І яны авалодалі гэтымі траншэямі, уварваліся ў іх і выкінулі адтуль немцаў. Гэта была іх першая перамога. Перамога, якой яны так доўга чакалі.

Савецкае інфармацыйнае бюро аб гэтым паведамляла:

«Выконваючы баявы загад савецкага камандавання, польскія пехацінцы часцей дывізіі імя Тадэвуша Касцюшкі і танкісты танкавай часці імя «Героям Вестэрплатэ» ў раёне вёскі Леніна прарвалі абарону немцаў і імклівай атакай выбілі іх з некалькіх населеных пунктаў. Ворагу нанесены вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы. Каля трохсот гітлераўцаў, у тым ліку трынаццаць нямецкіх афіцэраў, здаліся ў палон палякам.

Спробы праціўніка спыніць імклівае наступленне польскай пяхоты шляхам масавага прымянення пікіруючых бамбардзіроўшчыкаў і контратак, падтрыманых самаходнымі гарматамі «Фердынанд» і танкамі, не мелі поспеху.

Контратакі гітлераўцаў былі адбіты з вялікімі для іх стратамі. Гітлераўцы не вытрымалі штыкавых удараў і артылерыйскага агню палякаў».

За мужнасць, адвагу і баявое майстэрства, праяўленыя ў баі пад Леніна, 239 польскіх салдат і афіцэраў былі ўзнагароджаны савецкімі ордэнамі і медалямі. Капітан Ю. Губнер удастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза. Гэта высокае званне пасмяротна прысвоена капітану В. Высоцкаму і дзевятнаццацігадовай польскай патрыётцы, стралку жаночай роты аўтаматчыкаў, Анэлі Кжывонь.

Можа, бой пад невялікай беларускай вёскай Леніна не вывучаецца ў ваенных акадэміях, але хіба хто-небудзь назаве яго боем мясцовага значэння...



Вышыня 215,5. Год 1968.

Вышыня 215,5. 1943 год.

Бітва воінаў Першай польскай дывізіі імя Касцюшкі пад Леніна мае вялікае гістарычнае значэнне. Яна з'явілася першым баявым крышчэннем народжанага ў баях з нямецкім фашызмам новага Народнага Войска Польскага. Дзень, калі пачаўся гэты бой — 12-га кастрычніка, лічыцца днём нараджэння гэтага Войска. Ад вёскі Леніна пачаўся славуты шлях польскай арміі на захад. Услед за першай дывізіяй імя Тадэвуша Касцюшкі на тэрыторыі Савецкага Саюза ў хуткім часе былі сфарміраваны: Другая пяхотная дывізія імя Дамброўскага, першая танкавая брыгада імя «Героям Вэстэрплатэ», артылерыйская брыгада імя Юзэфа Бэма, Першы знішчальны авіяцыйны полк «Варшава».

Яны пачалі з Леніна, прайшлі праз Днепр, Віслу, Одэр, Нэйсэ... Пяцьсоттысячная польская армія скончыла вайну ў логаве фашысцкага звера — Берліне. У тым самым Берліне, дзе быў распрацаваны людаедскі план «Грун», план, які не пакідаў на зямлі месца такой краіне, як Польшча, і такім людзям, як палякі!

■

Я стаю ля самай вяршыні вышыні 215,5, той самай, што была абведзена на аператыўнай карце камандзіра дывізіі імя Касцюшкі Зыгмунда Берлінга чырвоным кружочкам. Некалі яна была ключавой у абароне немцаў — сёння на ёй узведзены мемарыяльны комплекс, прысвечаны баявой садружнасці Савецкай Арміі і Войска Польскага.

Комплекс складаецца з мемарыяльнага музея, пабудаванага па праекту маскоўскіх архітэктараў Я. Белапольскага і В. Хавіна і помніка польскім і савецкім воінам, створанага заслужаным дзеячом мастацтваў РСФСР, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі, скульптарам Ул. Цыгалем.

Леніна зараз падобна на вялікую будаўнічую пляцоўку. Равуць цяжкія самазвалы, грукацяць перфаратары, на ўзлессі, крыху ў баку ад помніка і музея, разбіты палаткі ваеннага лагера — там жывуць салдаты, якія будуюць мемарыял. І ўдзень і ўначы не сціхае напружаны рытм будаўніцтва — засталіся апошнія аддзелачныя работы.

Ад вёскі да мемарыяла пралягла шырокая асфальтавая магістраль, вакол будынка пракладваюцца бетонныя дарожкі, якія акаймоўваюцца прыгожымі дэкаратыўнымі дрэвамі і кустамі. Аснову музея складае вялікая дыярама даўжынёй у васемнаццаць метраў. Мастакі студыі імя Грэкава М. Авечкін і А. Інтэзараў здолелі перадаць атмасферу той імклівай атакі, у якую ішлі польскія салдаты. Вось так, як і ў тую кастрычніцкую раніцу, дваццаць пяць год назад, штурмуюць яны вышыню 215,5, вышыню, на якой сёння стаіць помнік іх мужнасці і геройству...

Сам помнік зроблен проста, матэрыялам для яго паслужыў суровы шэры бетон... Дзве рукі моцна трымаюць ложа сімвалічнага аўтамата, дужыя, звыклыя з цяжкай працай рукі польскага і рускага салдата. Справа ад мемарыяла знаходзіцца братняя магіла польскіх і савецкіх салдат. На шэрых мармуровых плітах высечаны надпісы на польскай і рускай мовах, а над магілай — помнік загінуўшым, крыло салдацкага шыняля, прабітае асколкамі і кулямі...

Заўтра ў святочных абставінах адбудзецца адкрыццё помніка і мемарыяльнага музея. Больш за трыста каштоўных экспанатаў прыслалі сюды работнікі музея Народнага Войска Польскага, Цэнтральнага музея Савецкай Арміі, Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама піянеры сярэдняй школы ў Леніна.

Перад уваходам у музей — баявыя сцягі польскіх і савецкіх часцей, якія плячо ў плячо змагаліся з фашысцкімі захопнікамі. На стэндах — асабістыя рэчы польскіх салдат, фотаздымкі... Амаль усю заднюю сцяну дыярамы займае пояс, складзены са здымкаў і дакументаў, якія раскажуць пра баявую дружбу польскіх і савецкіх салдат. Над афармленнем экспазіцыі працавалі маладыя беларускія мастакі, нядаўнія выпускнікі Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута Э. Агуновіч, А. Валатовіч, М. Лашкоў, А. Рыбчынскі.

Змяніла сваё аблічча і вёска Леніна. Цяпер яна падобная на невялікі добраўпарадкаваны гарадок з новай школай, бальніцай, гандлёвым цэнтрам і рэстаранам на 500 месц. Уздоўж галоўнай вуліцы размясціліся прыгожыя мураваныя дамы сялян.

Чырвоным полымем зяе на сонцы лісце маладога саду. Ён раскінуўся ля падножжа вышыні, на якой стаіць помнік, ля падножжа вышыні, якая была адзначана на аператыўнай карце камандзіра дывізіі імя Тадэвуша Касцюшкі дваццаць пяць год таму...

А. БЕЛАВУСАЎ,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

АЎТАР МУЗЫКІ — НАСТАЎНІК

Вядучы аб'явіў: выступае хор Дзяржынскага раённага Дома культуры. Выконваецца песня Віктара Аўчыннікава на словы Анатоля Астрэйкі «У нас у рэспубліцы свята».

І палілася, запоўніла залу простая, але задушэўная і хвалюючая мелодыя...

Песні самадзейнага кампазітара Віктара Аўчыннікава зусім маладыя, але яны набываюць усё большую папулярнасць, пачынаюць трывала ўваходзіць у рэпертуар многіх калектываў мастацкай самадзейнасці. Хор Брагінскага раённага Дома культуры, напрыклад, рыхтуе да юбілею рэспублікі адну з песень Віктара Аўчыннікава «Я бачыў Расію». Самадзейным артыстам Быхаўскага раёна палюбілася задушэўная песня В. Аўчыннікава «Вячарняя лірычная».

Кампазітар-аматар выкладае спевы ў Бараўскай сярэдняй школе. Каля дваццаці песень напісаў ён. Адна з іх — «Вячарняя лірычная» — нядаўна па просьбе чытачоў была надрукавана на старонках «Чырвонай змены».

І. ШАБАЛІНСКІ.

ПЕСНІ, НАРОДЖАНЫЯ Ў ТУРМЕ

НОВЫ ЭКСПАНАТ НАРОДНАГА МУЗЕЯ ГЛЕБА КРЖЫЖАНОЎСКАГА

Народны музей віднага бальшавіка-ленінца, савецкага вучонага Глеба Кржыжаноўскага ў Куйбышаве-на-Волзе папоўніўся новым экспанатам. Гэта фотакопія пісьма Кржыжаноўскага навучэнцам Куйбышаўскага чыгуначна-будаўнічага тэхнікума, якое раней не публікавалася. Датавана пісьмо 27 снежня 1955 года, напісана на бланку Акадэміі навук СССР, сапраўдным членам якой быў аўтар. Гэта расказ аб гісторыі стварэння рэвалюцыйных песень «Варшавянка» і «Беснуйтесь, тираны».

«Варшавянка» — польская рэвалюцыйная песня, напісана ў васьмідзесятых гадах мінулага стагоддзя Вацлавам Свянціцкім. Аднак польскі тэкст «Варшавянкі» быў знаёмы невялікаму колу людзей. І калі пазней песня стала сапраўды масавай, дык гэтым яна абавязана перш за ўсё аўтару рускага тэксту Глебу Кржыжаноўскаму. Вось што паведамляе Кржыжаноўскі ў сваім пісьме:

«...Пасля майго арышту ў 1895 годзе і асуджэння царскім судом на ссылку ў Сібір я быў заключаны ў маскоўскую Бутырскую турму. Разам са мной у камеры сядзела некалькі польскіх рабочых і трое буйных прадстаўнікоў польскай сацыялістычнай партыі (ППС) — Абрамовіч, Пяткевіч, Стражэцкі. Яны ведалі песню Свянціцкага «Варшавянка» і цудоўна яе выконвалі. Напэў песні быў вельмі прыгожы, але мы, рускія рэвалюцыянеры, не маглі яе спяваць, таму што не ведалі польскай мовы. І я задумаў стварыць рускую «Варшавянку». Падрадковы пераклад з польскай мовы зрабілі для мяне польскія таварышы. Мне давялося ў сваім вершы даволі істотна перапрацаваць першапачатковы тэкст Свянціцкага. Усе вобразы, чужыя свядомасці пралетарыята, я адкінуў, стараючыся напоўніць песню пралетарскім зместам».

Тут жа, у Бутырцы, адбылося першае выкананне «Варшавянкі».

Далей Кржыжаноўскі піша:

«Другая з напісаных мной песень — «Беснуйтесь, тираны» была створана ў сібірскай ссылцы ў 1898 годзе. Вытокам для яе паслужыла пісня рускіх студэнтаў Львоўскага універсітэта «Шалійте, шалійте, скажены каты». Напэў быў запазычаны з украінскай оперы «Наталля» Вахняніна, папулярнай у 90-х гадах. Песню львоўскага студэнцтва я перапрацаваў і пашырыў. Шостае чатырохрадкоўе ў мяне завяршаецца ўсклікам: «И смерть, и смерть, и смерть вам, тираны!» Баявы настрой песні к канцу паступова нарастае, выказваючы пагрозу ворагам і магутную сілу пралетарыята.

У сібірскай ссылцы, дзе нам даводзілася сустракацца з У. І. Леніным, мы часта спявалі абедзве песні: «Варшавянку» і «Беснуйтесь, тираны». Яны сталі аднымі з самых любімых песень Уладзіміра Ільіча. Ён сам спяваў іх з незвычайным натхненнем».

Пісьмо Кржыжаноўскага апублікавала куйбышаўская абласная газета «Волжская камуна». Але чаму іменна куйбышаўцам — будучым чыгуначнікам расказаў Кржыжаноўскі так падрабязна і цікава гісторыю стварэння сваіх лепшых рэвалюцыйных песень?

У гэтым няма выпадковасці. Нарадзіўся Кржыжаноўскі ў Самары, (цяпер Куйбышаў). Там жа атрымаў сярэднюю адукацыю. Яшчэ студэнтам Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута ўключыўся ў марксісцкі рух.

Дзе б і кім ні працаваў Кржыжаноўскі, ён не парываў з родным горадам. Адзін з першых ён прапанаваў пабудаваць на Волзе ў Жыгулях магутную гідраэлектрастанцыю. Ён заўсёды ахвотна адгукаўся на пісьмы сваіх землякоў і іх просьбы.

Яго актыўнымі карэспандэнтамі былі члены гістарычнага гуртка чыгуначнага будаўнічага тэхнікума. Яны ж і папрасілі Кржыжаноўскага больш падрабязна расказаць гісторыю стварэння шырока вядомых рэвалюцыйных песень. Знайшлі пісьмо актывісты народнага музея Г. М. Кржыжаноўскага, створанага два гады назад у лакаматыўным дэпо, дзе Глеб Максімільянавіч працаваў у пачатку стагоддзя і перад уваходам у якое цяпер узвышаецца яму помнік, створаны на асабістыя збіранні куйбышаўскіх чыгуначнікаў.

Анатоль ПРАЗДНІКАЎ,
карэспандэнт АДН.

50 год БССР
Насустрач слаўнаму юбілею

БУДУЧЫНЯ ГАРАДСКІХ ЦЭНТРАЎ

Нашы гарады растуць і прыгажэюць. У іх узнікаюць новыя раёны і рэканструююцца старыя. Архітэктары ўвесь час заклапочаны пошукамі найлепшага вырашэння ў нашых гарадах грамадскіх цэнтраў. Менавіта гэтым праблемам, праблемам рэканструкцыі і развіцця грамадскіх цэнтраў гарадоў быў прысвечаны пленум Саюза архітэктараў СССР, які нядаўна адбыўся ў Ленінградзе.

У гэтых нататках мне хацелася б расказаць пра тыя праблемы, што абмяркоўваліся на пленуме, — яны надзённыя таксама і для беларускага горадабудаўніцтва. Мне хацелася б падзяліцца думкамі пра шляхі, якімі ідуць або неўзабаве пойдуць горадабудаўнікі нашай рэспублікі.

ЖЫЦЦЁ ДЫКТУЕ

Спачатку — агульныя высновы.

Вядома, што іменна ў цэнтрах гарадоў размяшчаюцца найчасцей важнейшыя адміністрацыйныя, гандлёвыя, культурна-асветныя ўстановы. Таму, вырашаючы архітэктуру гарадскога цэнтра, дойлід мусіць улічваць, наколькі год ад году павышаецца інтэнсіўнасць гарадскога жыцця, перспектывы росту насельніцтва горада, навукова-тэхнічны прагрэс у краіне ў цэлым. Правільна арганізаваць так званы дзелавы цэнтр горада — складаная і вельмі важная задача. Адміністрацыйныя і культурныя ўстановы, асноўныя прадпрыемствы гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання трэба размяшчаць як найзручней. Тут неабходны добра прадуманыя планы і абгрунтаваныя праграмы рэканструкцыі, бо памылкі ў горадабудаўніцтве часцей за ўсё непапраўныя.

Добраўпарадкоўваючы цэнтр, нельга забываць, што ён фарміруе архітэктурна-мастацкае аблічча горада. Цэнтр — гэта вядучы архітэктурны акорд у гарадской сімфоніі, які надае непаўторнасць, адметнасць усяму гораду.

Не сакрэт, што мы да апошняга часу асноўную ўвагу аддавалі будаўніцтву жылля. А тым часам праблемы зручнасці і прыгажосці гарадскіх цэнтраў паступова накопліваліся, і сёння стала ясна, што тэмпы будаўніцтва жылля, рост насельніцтва гарадоў, бурнае развіццё гарадскога транспарту не дазваляюць больш надоўга адкладваць рэканструкцыю цэнтраў. Чаго граха таіць, слова «рэканструкцыя» было да нядаўняга часу ў нас ледзь ці не забароненым. Але жыццё ёсць жыццё. Яно дыктуе, каб дойліды і будаўнікі ліквідавалі пралікі, дапушчаныя раней пры забудове і фарміраванні гарадскіх цэнтраў.

Вось і наш Мінск патрабуе ад нас, каб мы паклапаціліся пра будучыню цэнтра. Партыя і ўрад рэспублікі надаюць праблеме рэканструкцыі цэнтра сталіцы вялікае значэнне. Заканадаўча ўстаноўлена, што з 1971 года планамерна будуць рэканструявацца старыя раёны цэнтральнай часткі горада. 50 працэнтаў новага будаўніцтва ў Мінску сканцэнтруецца ў межах другога гарадскога кальца. Каб атрымаць належны горадабудаўнічы эфект, мяркуецца будаваць шмат дамоў з павышанай колькасцю паверхаў: за 1971—1975 гады ўдзельная вага такіх дамоў у цэнтры дасягне 70 працэнтаў. Прадугледжана паступова вывесці з цэнтра прамысловыя прадпрыемствы, склады, базы, развіваць вакол цэнтральнага раёна горада сады і паркі. Цэнтр Мінска ператворыцца ў цэласны архітэктурны ансамбль, згарманізаваны з ужо існуючымі зялёнымі масівамі і водным люстрам Свіслачы. Намечана прыступіць да рэканструкцыі транспартных сродкаў Ленінскага праспекта, вуліц Нямігі, Мясніковa, Першамайскай і іншых.

Каб найлепш вырашыць задачу рэканструкцыі цэнтра Мінска, Дзяржбуд СССР з удзелам Саюза архітэктараў СССР праводзіць усесаюзны конкурс. У гэтым конкурсе прымаюць удзел творчыя калектывы Мінскпраекта, Белдзяржпраекта, Маскоўскага архітэктурнага інстытута і Цэнтральнага навуковага і праектнага інстытута па горадабудаўніцтву (Масква). Ужо адбыліся аналагічныя конкурсы па рэканструкцыі цэнтраў Масквы, Горкага, Пярмі, Саратава, Новасібірска, Уладзівастока і іншых гарадоў. У выніку ў галіне планіроўкі і забудовы грамадскіх цэнтраў намеціліся новыя тэндэнцыі, якія значна адрозніваюцца ад традыцыйных прынцыпаў.

Скарыстоўваючы тое лепшае, што ёсць у вопыце зарубежных дойлідаў, мы павінны помніць, што цэнтры нашых гарадоў маюць прынцыповыя сацыяльныя адрозненні ад капіталістычных. Таму сляпое капіраванне можа прынесці нашаму горадабудаўніцтву толькі непапраўную шкоду. Адным з галоўных бакоў творчасці савецкіх горадабудаўнікоў з'яўляецца ўвасабленне ў архітэктурных вобразах высокіх ідэалаў нашага грамадскага ладу.

І ўсё ж, як ні шкада, але мусім прызнаць, што наша горадабудаўнічая навука, нягледзячы на некаторыя відавочныя поспехі, у пытаннях планіроўкі і забудовы цэнтраў плянецца ў хвасце практыкі: яшчэ недастаткова вывучаны заканамернасці і асаблівасці планіровачнай структуры і дзейнасці цэнтра вялікіх гарадоў, а гэта замінае вырашаць многія практычныя задачы. Таму не можа не радаваць, што іменна ў Беларусі вырашана стварыць навукова-даследчы праектны інстытут па горадабудаўніцтву, які паможа нашым дойлідам паспяхова вырашаць надзённыя задачы.

ЯКІЯ Ж ЯНЫ, ГЭТЫЯ НОВЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ?

Яшчэ зусім нядаўна кампазіцыя грамадскага цэнтра найчасцей уяўляла сабой парадную магістраль і нанізаныя на яе плошчы. Звычайна такая парадная магістраль была і галоўнай транспартнай артэрыяй горада. Уласна, па такім прынцыпе фарміраваўся і пасляваенны цэнтр Мінска — Ленінскі праспект з плошчамі Леніна, Цэнтральнай і Перамогі. Аналагічныя рашэнні, прататып для якіх—Неўскі праспект у Ленінградзе, сустракаем і ў іншых гарадах Беларусі.

Традыцыйнае вырашэнне цэнтраў здольна было даваць неблагія мастацкія вынікі.

Аднак сёння асабліва відавочныя і недахопы традыцыйных рашэнняў. Гэтыя рашэнні, на жаль, даюць мала прасторы многім новым грамадскім комплексам. Між тым, трэба зрабіць іх лёгка даступнымі для насельніцтва і разам з тым агарадзіць ад шкоднага ўплыву транспарту, па-сучаснаму вырашыць эстэтыку цэнтраў.

Цэнтр горада, створаны паводле новых архітэктурна-планіровачных тэндэнцый, прадугледжвае развітую планіровачную сістэму. Цяпер ён уяўляецца дойлідам як прасторная азелянёная тэрыторыя з комплексамі грамадскіх будынкаў рознага прызначэння. Будынкі гэтыя трэба ізаляваць ад інтэнсіўных патокаў транспарту і зрабіць праз пешаходныя падходы даступнымі для насельніцтва. Для невялікіх гарадоў такое паняцце цэнтра, як кажуць архітэктары, «аптымальнае». А ў вялікіх гарадах (у Мінску) такі цэнтр — толькі ядро, вакол якога — цэлая сістэма грамадскіх цэнтраў, злучаных спецыяльнымі магістралямі з цэнтральным ядром, а таксама група спецыялізаваных цэнтраў (медыцынскіх, навуковых, вышэйшых навучальных устаноў і г. д.). Менавіта так генеральны план Мінска прадугледжвае арганізаваць гарадскі цэнтр.

У бліжэйшыя гады па фронту Паркавай магістралі вырастуць дванаццаціпавярховыя карпусы будынкаў Інстытута тэхнічнай інфармацыі, Дома кнігі, Белкаапсаюза. У першых паверхах гэтых будынкаў размесцяцца кафэ, рэстараны, магазіны і г. д. У зарэчнай частцы Паркавай магістралі размяшчаюцца комплекс гасцініцы на 23 паверхі з вялікім рэстаранам, будынак новай кансерваторыі.

Новыя ансамблі ўзнікнуць і ў поймennай частцы магістралі — на працягу вуліцы Леніна па напрамку да Магілёўскай шашы.

Ужо распачалося фарміраванне цэнтраў адміністрацыйных раёнаў. Так, напрыклад, ужо сёння нашым вачам адкрываецца развіты цэнтр Заводскага раёна. Тут размешчаны адміністрацыйныя будынкі раёна, будуецца гасцініца «Турыст» і ў бліжэйшыя гады вырасце буйны універмаг. У склад гэтага раёна ўвойдзе прымыкаючы да плошчы парк са спартыўным комплексам . Частка Партызанскага праспекта па сваёй архітэктуры ўжо сёння мае сталічнае аблічча, дзякуючы жылым і грамадскім будынкам з павялічанай колькасцю паверхаў. Аналагічна фарміруецца цэнтр Савецкага раёна, галоўны кампанент якога — амаль завершаная ўжо плошча імя Якуба Коласа.

Генеральны план Мінска прадугледжвае спецыялізаваныя цэнтры. Прынамсі, на працягу Паркавай магістралі і вуліцы Саўгаснай (у раёне Драздоў) узнікае комплекс вышэйшых навучальных устаноў (тут ужо вырас новы будынак інстытута фізкультуры). Навуковы цэнтр сфарміруецца ў раёне Азярышча.

Дзеля зручнасці насельніцтва сучасныя гарадскія цэнтры дзеляцца на асобныя зоны: адміністрацыйна-грамадскую, культурна-асветную, спартыўную і іншыя. Перавагі заніравання ўстаноў у цэнтрах тлумачацца магчымасцю аб'ядноўваць памяшканні аднатыпных устаноў у цэлыя комплексы. Павелічэнне вышыні будынкаў значна скарачае кошт будаўніцтва. Насельніцтва выйграе час на розныя маршруты па цэнтры. Ствараюцца новыя магчымасці мастацкага вырашэння цэнтра: забудова буйнымі комплексамі надае ім неабходную маштабнасць, манументальнасць.

У Мінску гэты прынцып заніравання відаць ужо ў тым, што раён плошчы імя Леніна набывае рысы адміністрацыйна-дзелавога цэнтра, раён Цэнтральнай плошчы — культурна-асветнага, раён вуліц Нямігі—Мяснікова—пасля рэканструкцыі — рысы гандлёвага цэнтра і г. д.

Нельга, аднак, не ўлічваць, што заніраванне павінна весціся ў разумных межах. Калі, напрыклад, захаваць у чыстым выглядзе зону адміністрацыйна-дзелавой часткі цэнтра, дык увечары гэта будзе, па сутнасці, мёртвая зона. Зацямнёныя вокны пустуючых увечары адміністрацыйных будынкаў ствараць пэўны «правал» у значнай частцы цэнтра. Таму зусім разумна размяшчаць у адміністрацыйна-дзелавой зоне і ўстановы абслугоўвання насельніцтва (кафэ, рэстараны, магазіны і да т. п.), якія ажывілі б цэнтр увечары. Перш за ўсё гэта датычыць плошчы імя Леніна ў Мінску. Пры далейшай яе рэканструкцыі непазбежна давядзецца размясціць тут установы, якія маглі б працаваць увечары. Часткова праблема вырашаецца, дзякуючы блізкаму суседству гасцініцы «Мінск» з новай прыбудовай «Інтурыст». Аднак для паўнакроўнага жыцця плошчы як элемента цэнтра ўвечары гэтага яўна недастаткова.

Размешчаным тут вышэйшым навучальным установам нязручна і цесна. Відаць, мэтазгодна было б перабазіраваць іх на больш зручныя тэрыторыі. Трэба сказаць, што буйны медыцынскі інстытут з клінічнай бальніцай на тысячу ложкаў будзе створаны ў новым раёне між знешняй Кальцовай магістраллю і жылым раёнам «Зялёны Луг». Неабходна, мабыць, падумаць і пра перавод на новае месца Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Яшчэ больш складаныя ўмовы ў педагагічнага інстытута імя Горкага, будынак якога стаіць літаральна ў цісках магістраляў.

Напэўна, варта размясціць сярод цэнтра і асобныя жылыя комплексы, якія сваім сілуэтам, па-мастацку вырашанымі экстэр'ерамі першых паверхаў унясуць неабходны кантраст у кампазіцыю цэнтра. Акрамя таго, гэта дапаможа вырашыць задачу размяшчэння кадраў, якія працуюць у цэнтры.

Праблемы, якія я тут закранаю, прадмет актыўнага роздуму не толькі для беларускіх горадабудаўнікоў. Аналагічныя пытанні вырашаюць дойліды ўсіх буйных гарадоў краіны, а таксама многія іх калегі за рубяжом.

ПРАБЛЕМЫ ТРАНСПАРТНЫЯ

Гэта толькі так здаецца, што транспарт не ўплывае на фарміраванне гарадскога цэнтра. На справе ж, як толькі спрабуюць рашыць гэтую праблему без уліку імклівага ўдасканальвання сродкаў транспарту, прымяняючы традыцыйную канцэнтрычную сістэму трасіроўкі вуліц, — узнікае процьма нераспрацаваных пытанняў. А вынік — перагрузка цэнтральнай часткі горада транзітнымі маршрутамі, хаця і без таго тут засяроджана вялікая група грамадскіх будынкаў, куды едзе вельмі многа людзей, якіх неабходна абараніць ад шуму і загазаванасці паветра, забяспечыць зручнымі пешаходнымі пераходамі.

Звычайна цэнтр буйнага горада — месца, дзе больш за ўсё гістарычных помнікаў, найбольш значных грамадскіх будынкаў і жылых комплексаў. На параўнальна невялікай тэрыторыі цэнтра канцэнтруюцца самыя магутныя патокі транспарту і пешаходаў. (Сёлета ў Беларускім політэхнічным інстытуце архітэктар І. Іёда абараніла дысертацыю, прысвечаную колькасці наведвальнікаў гарадскога цэнтра малых гарадоў. Аказваецца, што цэнтр наведвае больш людзей, чым раёны вялікіх прамысловых прадпрыемстваў).

У малых і сярэдніх гарадах, як правіла, праз галоўныя вуліцы ідзе транзітны транспарт, перасякаючы размешчаныя на іх цэнтральныя плошчы. У выніку штогод усё больш цяжкасцей для дзейнасці цэнтраў, усё больш небяспечны рух пешаходаў на іх. Неабходна загадзя вырашаць, як тут неўзабаве пойдзе транспарт — у абход населеных пунктаў або па другіх вуліцах у абход цэнтра. Гэта аднолькава актуальна для такіх гарадоў, як Жлобін і Лагойск, Стоўбцы і Барысаў і г. д. На жаль, горадабудаўнікі пакуль баяцца новых рашэнняў транспартных праблем у генеральных планах гарадоў. З вялікімі цяжкасцямі ўдалося пераканаць, напрыклад, аўтараў праекта Жодзіна, што існуючую аўтамагістраль варта захаваць толькі як галоўную вуліцу горада, а транзітныя патокі пусціць па новай трасе ў абход горада.

На левым беразе ракі Свіслач хутка вырасце гэта гасцініца-прыгажуня, праект якой распрацавалі ў інстытуце «Мінскпраект» архітэктары Л. Пагарэлаў, М. Ткачук, Н. Шпігельман і інжынер Г. Басінкевіч.

Больш складана ўпарадкаваць транспарт у цэнтрах вялікіх гарадоў і асабліва ў Мінску. Мы спрабуем арганізаваць дубліраванне Ленінскага праспекта як транспартнай магістралі, стварыць скарасныя гарадскія дарогі, прызначаныя толькі для транспарту (без пешаходаў), а таксама магістралі, якія праходзілі б на розных узроўнях на перасячэннях з гарадскімі. Аднак гэтага недастаткова. Зарубежны і айчынны вопыт сведчыць, што найбольш радыкальнае рашэнне праблемы транспарту ў цэнтрах гарадоў — так званае вертыкальнае заніраванне, г. зн. патокі транспарту прапускаюцца шматярусна на розных узроўнях ад патоку пешаходаў. Напрыклад, у новым дзелавым цэнтры Парыжа па некалькіх падземных паверхах ідуць: мясцовы транспартны рух, міжгародныя аўтамабільныя патокі, чыгункі, метро. У цэнтры Бірмінгэма (Англія) на ўзроўні зямлі разбіты скверы і прадугледжаны аўтастаянкі, на другім падземным узроўні пракладзены дарогі для аўтамабіляў і чыгункі, а над зямлёй — гандлёвы і дзелавы цэнтр. У Токіо ўжо створаны адрэзак магістралі, дзе аўтамабілі рухаюцца нават над дахамі будынкаў... Такім чынам, не толькі ў фантазіі інжынераў і архітэктараў, але і на практыцы ёсць прыклады вертыкальнага заніравання цэнтраў буйных гарадоў.

Адна праблема вядзе за сабой другую — дзе хадзіць пешаходу? На зямлі — па скверах і парках, пад сонечнымі праменнямі або пад зямлёй? Мы пешахода, як ні дзіўна, чамусьці, як правіла, «заганяем» пад зямлю. Прыгадайце, напрыклад, доўгія падземныя пераходы, па якіх тысячныя натоўпы масквічоў рухаюцца з вуліцы Горкага да Краснай плошчы. А яшчэ не так даўно, калі я быў студэнтам Маскоўскага архітэктурнага інстытута, мы свабодна гулялі па былой Манежнай плошчы, дзе часта ля будынка былога Манежа выступалі розныя творчыя калектывы. Неяк дзіўна зараз бачыць бязлюдную плошчу, па якой імчацца толькі аўтамабілі.

Куды правільней было б прапускаць транспарт пад плошчамі і вуліцамі. Праўда, гэта патрабуе многа сродкаў, і сёння, калі мы яшчэ не цалкам вырашылі, напрыклад, праблему жылля, — такія рашэнні няпроста ажыццявіць. І ўсё ж неўзабаве мы вымушаны будзем перагледзець пры праектаванні традыцыйнае стаўленне да інжынернага абсталявання новых вуліц, не забіваць іх падземную прастору інжынернымі камунікацыямі, каб не ўскладняць сабе ажыццяўленне прагрэсіўных ідэй заніравання тэрыторыі цэнтра заўтра.

У комплекснай схеме развіцця гарадскога транспарту Мінска прадугледжаны транспартныя пуцеправоды пад зямлёй і ў тунелях, напрыклад, па напрамках вуліцы Леніна да Паркавай магістралі (на адрэзку ад вуліцы Першамайскай да плошчы Свабоды), а таксама на працягу вуліцы Свярдлова — пад плошчаю імя Леніна і г. д.

У некаторых выпадках на незабудаваных тэрыторыях мэтазгодна прапусціць гарадскія магістралі над паверхняю зямлі па эстакадах. Так прадугледжана зрабіць на кальцавой магістралі, якая апаясвае цэнтр Мінска (у межах парку Перамогі).

Не так даўно мы недаацэньвалі ўласны аўтатранспарт. У генеральных планах на 1000 жыхароў прадугледжвалася 12 аўтамашын. Цяпер перспектыўныя нормы павялічыліся з 10—12 да 150—180 аўтамабіляў на 1000 жыхароў. Узнікае пытанне аб допушчальных межах насычэння гарадоў аўтатранспартам, бо на пэўным этапе гэты транспарт у горадзе не памагае, а перашкаджае хуткасці руху. Рашэнне парадокса ў тым, каб разам з развіццём аўтамабільнага транспарту індывідуальнага карыстання ўсяляк развіваць скарасны рэйкавы камунальны транспарт (метрапалітэн і падземны трамвай). Вопыт буйнейшых гарадоў свету паказвае, што ўжо цяпер хуткасць руху ў цэнтрах, забітых аўтамабілямі, скарацілася да 10—20 кіламетраў у гадзіну, а скарасны камунальны транспарт здольны забяспечыць хуткасці ў шмат разоў большыя. Як жа быць з індывідуальным аўтамабілем?

На наш погляд, найбольш мэтазгодна, каб аўтамабілі дастаўлялі сваіх гаспадароў да зоны цэнтраў або да прыпынкаў скарасных відаў транспарту (у месцы, дзе ў будучым павінны быць створаны адпаведныя шматпавярховыя і падземныя прасторныя стаянкі), а затым пасажыр карыстаецца камунальным транспартам або пешаходнымі магістралямі. Галоўнае ж скарыстанне асабістага аўтамабіля будзе для сувязі з мясцінамі адпачынку, бо колькасць вольнага ад работы часу будзе няспынна ўзрастаць.

Мабыць, у Мінску найбольш перспектыўна — арганізацыя ў будучым буйных стаянак пад зямлёй, а ў радзе месцаў (у першую чаргу па перыметры цэнтральнага раёна) стварэнне шматпавярховых гаражоў гасцінічнага тыпу і гаражоў-стаянак. Варта таксама адзначыць зусім нездавальняючае абслугоўванне аўтамабіляў асабістага карыстання. На нашу думку, Міністэрству аўтамабільнага транспарту БССР, паколькі ў бліжэйшыя гады чакаецца вялікі прырост парка аўтатранспарту, неабходна значна актыўней развіваць сістэму станцый тэхнічнага абслугоўвання.

ЭСТЭТЫКА ЦЭНТРА

Эстэтыка цэнтра — прадмет асаблівага клопату не толькі архітэктараў, мастакоў, скульптараў, але і ўсяго насельніцтва. Невыпадкова ва ўсе эпохі пытанням самабытнасці, мастацкай выразнасці архітэктурных ансамбляў цэнтраў надавалася асаблівае значэнне. Гэта адлюстравана і ў народнай мудрасці — «што ні горад — дык нораў».

Наша айчынная архітэктура — яркае сведчанне разнастайных магчымасцей кампаноўкі цэнтраў. Маскоўскі Крэмль і класічны ансамбль Пецярбурга, старажытныя Ноўгарад, Пскоў, разнастайныя па кампазіцыі цэнтры Гомеля і Магілёва, Полацка і Ружан.

За апошнія гады ў забудове не толькі жылых масіваў, але і грамадскіх комплексаў з'явіўся пэўны штамп. Цяпер, калі архітэктары атрымалі права на індывідуальнае праектаванне многіх унікальных грамадскіх будынкаў, штамп у архітэктурным абліччы грамадскіх комплексаў зусім нецярпімы. Нягледзячы на агульнае прызнанне, што будаўніцтва ўрадавых будынкаў, буйных палацаў культуры, тэатраў і г. д. павінна весціся толькі па індывідуальных праектах, на практыцы ў многіх гарадах цэнтры забудоўваюцца аднатыпна. Для прыкладу скажам, што праекты такіх будынкаў, як Палац спорту ў Мінску, запатрабавалі з некалькіх гарадоў для паўторнага прымянення. Наўрад ці правільна гэта.

Калі для масавага жыллёвага будаўніцтва высокаякаснае тыпавое праектаванне неабходнае, дык пры стварэнні грамадскіх асноўных будынкаў павінны прымяняцца толькі індывідуальныя праекты. У Мінску за апошнія гады пабудаваны гарвыканком, Палац спорту, Палац камвольнага камбіната, плавальны басейн, кінатэатры «Партызан», «Піянер» і г. д. І ўсім відзён значны ўплыў гэтых будынкаў на фарміраванне сучаснага аблічча горада. Усё гэта добра. Аднак архітэктурная (і не толькі архітэктурная) грамадскасць непакоіцца з тае прычыны, што з'яўляюцца ўжо штампы, шаблон у вырашэнні архітэктарамі шэрагу аб'ектаў. Так, напрыклад, высотныя будынкі ў нас як правіла вырашаюцца ў выглядзе «скрынкі», пастаўленай гарызантальна або вертыкальна з тупым завяршэннем. Выразнасці сілуэта, пластыцы будынкаў не надаецца дастатковай увагі.

Непакоіць аднастайнасць архітэктуры фасадаў многіх грамадскіх будынкаў, вырашаных безадносна да іх прызначэння — у выглядзе «цяльняшкі», дзе ашкленыя палосы чаргуюцца з палосамі панелей, або ў выглядзе вертыкальных аднастайных чляненняў. Мала чым, напрыклад, адрозніваюцца між сабой па архітэктуры будынак праектных арганізацый на плошчы Свабоды і прамысловыя будынкі па вуліцах Куйбышава і Варвашэні.

Да апошняга часу не зжыта «шкломанія». Вялікія ашкленыя вітражы ў многіх будынках зусім не адпавядаюць прызначэнню. Яны выклікаюць улетку перагрэў, а ўзімку — пераахаладжэнне. Дарэчы, як паведамлялася нядаўна ў прэсе, амерыканскія вучоныя знайшлі нават хваробу «шклобоязі» ў жыхароў амерыканскіх гарадоў, якія жывуць у высотных будынках з багатым ашкленнем фасадных плоскасцей. Такім чынам, некрытычнае пераймание замежных узораў не спрые дасягненню пажаданых эстэтычных і функцыянальных вынікаў.

У той жа час нельга не падкрэсліць, што да апошняга часу нашы архітэктары вельмі абмежаваны ў палітры аддзелачных матэрыялаў і былі пазбаўлены магчымасці скарыстання маналітных жалезабетонных канструкцый, якія дапускаюць любую пластыку фасаду (яна залежыць толькі ад апалубкі). Зусім відавочна, што маналітны жалезабетон, які шырока скарыстоўваецца ў замежнай практыцы, павінен, нарэшце, і ў нашым дойлідстве атрымаць шырокія правы грамадзянства. Тут ёсць чаму павучыцца ў нашых сяброў у сацыялістычных краінах.

Міністэрства будаўніцтва БССР праявіла пэўную ініцыятыву, намерыўшыся пабудаваць у Мінску эксперыментальны дом падобнай канструкцыі. Мабыць, Саюзу архітэктараў, Дзяржбуду рэспублікі трэба ўдзяліць значна больш увагі эксперыментальнаму праектаванню будынкаў з маналітнага жалезабетону, каб мы ў бліжэйшыя гады маглі будаваць такія дамы ў цэнтральных раёнах.

Такім чынам, індывідуальнае ў архітэктурным абліччы грамадскіх і жылых будынкаў — адно з абавязковых патрабаванняў эстэтыкі гарадскіх цэнтраў.

Наступнае важнейшае патрабаванне — дасягненне ансамбля пры забудове. Каб новыя будынкі стваралі цэласны архітэктурны ансамбль, абавязкова трэба распрацоўваць адзіны праект забудовы ўсяго ансамбля, арганізоўваць адзінае творчае кіраўніцтва гэтым будаўніцтвам.

Бліскучы прыклад ажыццяўлення гэтага прынцыпу — стварэнне за кароткі тэрмін адрэзку Ленінскага праспекта ў Мінску між вуліцай Свярдлова і плошчай Перамогі. На аснове распрацаванага ў выніку конкурсу праекта забудовы была дакладна вызначана горадабудаўнічая характарыстыка кожнага будынка. На жаль, у пяцідзесятыя гады, калі асноўная ўвага ўдзялялася масаваму будаўніцтву жылля па тыпавых праектах, мы не цалкам скарыстоўвалі каштоўны вопыт забудовы Ленінскага праспекта. Гэты вопыт яшчэ надоўга для нас будзе павучальным. Цэнтры большасці беларускіх гарадоў размешчаны на ўзвышанасцях, ля берагоў рэк і азёр, паблізу зялёных масіваў. Прыгадаем, напрыклад, цудоўныя прыродныя ўмовы для рэканструкцыі і развіцця цэнтраў Магілёва, Полацка, Барысава, Віцебска, Гродна. Трэба максімальна скарыстоўваць гэтыя спрыяльныя ўмовы, раскрыць гарадскія цэнтры ў бок рэк, стварыўшы набярэжныя і паркі, ачысціць берагі рэк ад выпадковай забудовы дарэвалюцыйных і даваенных гадоў, а ў многіх выпадках і ад прамысловых прадпрыемстваў. Пры распрацоўцы генеральных планаў гарадоў за апошнія гады ўнесена нямала цікавых прапаноў, рэалізацыя якіх узбагаціць аблічча гэтых гарадоў. Аднак пакуль што далёка не заўсёды і недастаткова прафесіянальна скарыстоўваем прыродныя ўмовы.

Калі ж умовы гэтыя не зусім спрыяльныя, трэба ўмешвацца ў прыроду, ствараючы спрыяльны ландшафт сваімі рукамі. Класічны прыклад — наша беларуская сталіца, у цэнтры якой на вузенькай мелкаводнай Свіслачы створана шырокае воднае люстра з новымі паркамі па берагах. Гэты вопыт, які ўвайшоў у гісторыю савецкага горадабудаўніцтва, варта актыўней скарыстоўваць у забудове цэнтраў беларускіх гарадоў.

У эстэтыцы цэнтраў неацэнная роля сінтэзу мастацтваў. Манументы і дэкаратыўная скульптура, фрэскі і мазаічныя пано, рэклама і вітрыны, малыя архітэктурныя формы і розныя іх элементы — гэта сродкі не толькі мастацкай выразнасці, але і ідэйнага гучання гарадскіх ансамбляў. Сёння ўзмацненне ідэйнага гучання існуючых і новых ансамбляў цэнтраў сродкамі манументальнай прапаганды вельмі актуальнае.

Тут у нас нямала нявырашанага. Нярэдка мастакі, скульптары запрашаюцца да садружнасці тады, калі будаўніцтва ўжо завяршаецца і ім адводзіцца роля афарміцеляў. У такіх выпадках гаварыць пра арганічны сінтэз не даводзіцца. Але нямала выпадкаў, калі манументы праектуюцца без патрэбнага кантакту скульптараў з архітэктарамі і ствараюцца без неабходнай увязкі з забудовай. У праектна-каштарыснай дакументацыі на будаўніцтва часта не прадугледжваецца мінімум неабходных сродкаў на манументальнае мастацтва. Для беларускага дойлідства гэтыя пытанні надзённыя і цяпер. Праўда, ёсць у нас і пэўныя станоўчыя прыклады сінтэзу мастацтваў (напрыклад, у Мінску — кінатэатры «Партызан» і «Піянер», Палац культуры камвольнага камбіната, кафэ «Планета» і інш.). Але ўсё гэта толькі першыя крокі.

І сёння неперавзыйдзены ўзор сінтэза архітэктуры і скульптуры ў Беларусі — комплекс Дома ўрада з помнікам У. І. Леніну — вынік творчага супрацоўніцтва такіх майстроў, як архітэктар І. Лангбард і скульптар М. Манізер. (На жаль, у новых умовах забудовы плошчы імя Леніна гэты ансамбль ужо не можа цалкам іграць тую ролю, на якую ў свой час быў разлічаны).

Як вядома, ЦК КП Беларусі і Савет Міністраў БССР надаюць вялікае значэнне развіццю манументальнай прапаганды ў рэспубліцы. Магчымасці манументальнай прапаганды — аднаго з актыўнейшых сродкаў ідэйна-эстэтычнага выхавання — скарыстоўваюцца ў нашым дойлідстве пакуль што недастаткова. Сёння ў рэспубліцы намечана шырокая праграма далейшага развіцця манументальнага мастацтва. У прыватнасці, прапанавана пры распрацоўцы генеральных планаў гарадоў і архітэктурных комплексаў шырэй скарыстоўваць творы манументальнага мастацтва, выдзяляючы неабходныя сродкі ў праектна-каштарыснай дакументацыі.

Такім чынам, у рэспубліцы створаны прадумовы, каб сродкамі манументальнай прапаганды ўзмацніць ідэйнае гучанне і мастацкую выразнасць ансамбляў цэнтраў нашых гарадоў.

СПАДЧЫНА І НАВАТАРСТВА

Цэнтры гарадоў — архітэктурны летапіс гісторыі народа, яго культуры, эстэтычных ідэалаў. Таму скарыстанне помнікаў архітэктуры і іх ансамбляў набывае важнейшае значэнне пры рэканструкцыі і развіцці старых гарадскіх цэнтраў.

Радуе, што ў нашай краіне значна ўзмоцнена ўвага да захавання помнікаў дойлідства. Але задача заключаецца не толькі і не столькі ў захаванні помнікаў старыны, колькі ў актыўным іх скарыстанні пры рэканструкцыі цэнтраў з мэтамі ўзмацнення ідэйнага гучання, надання індывідуальнасці архітэктурнаму абліччу цэнтраў і, нарэшце, у разумным скарыстанні па прызначэнні. Гэтыя пытанні павінны рашацца выключна індывідуальна ў кожным канкрэтным выпадку.

Узяць, да прыкладу, Талін. Тут склаўся завершаны ансамбль старога цэнтра, мадэрнізацыя якога магла б нанесці непапраўныя страты абліччу горада. І іх дойліды намячаюць ператварыць ансамбль цэнтра Таліна ў турысцкі цэнтр, насыціўшы яго адпаведнымі ўстановамі абслугоўвання турыстаў. Грамадскія ўстановы горада будуць канцэнтравацца па-за межамі цэнтра-запаведніка.

Іншая справа — Ленінград. Тут цэнтр мае выключную гістарычна-мастацкую значымасць, але разам з тым захоўвае прызначэнне сучаснага сэрца горада. Колішнія, яшчэ перадваенныя, спробы перанесці грамадскі цэнтр Ленінграда на новую тэрыторыю аказаліся безпадстаўнымі (хаця на новым месцы быў нават створаны Дом Саветаў). Таму ў Ленінградзе прадугледжваецца развіццё існуючага цэнтра. Будуць фарміравацца новыя архітэктурныя ансамблі (у прыватнасці — на Васільеўскім востраве, уздоўж Нявы) пры захаванні дамінуючага значэння цэнтра, які гістарычна склаўся. Паколькі ў гэтым цэнтры захавалася шмат жылых дамоў з устарэлымі планіроўкай і ўнутраным абсталяваннем ленінградцы актыўна рэканструююць іх «начынне», не мяняючы архітэктурнага аблічча. Гэты вопыт можна толькі вітаць і, магчыма, у шэрагу выпадкаў скарыстоўваць у нас у рэспубліцы.

У Маскве, у адрозненне ад Ленінграда, у старым дарэвалюцыйным цэнтры горада, побач з цудоўнейшымі помнікамі архітэктуры, непаўторным ансамблем Крамля, захавалася малакаштоўная эклектычная забудова купецкай Масквы. Яе рэканструкцыя, праведзеная ў перадваенныя гады з дастатковым тактам у дачыненні да Крамля (Ахотны рад, вуліца Горкага і інш.), аказалася абгрунтаванай. Стварэнне ў пасляваенныя гады высотных будынкаў па Садовым кальцы таксама ўзбагаціла кампазіцыю цэнтра. Дастаткова ўдаленыя ад Крамля, гэтыя будынкі не прынізілі яго маштабнасць (мы тут не кажам пра саму архітэктуру гэтых высотных будынкаў, на якіх адбілася творчая накіраванасць дойлідаў тагачаснага перыяду). На жаль, як адзначалася на пленуме Саюза архітэктараў СССР, створаныя ў апошнія гады паблізу Крамля гасцініца «Расія», новы высотны корпус гасцініцы «Нацыяналь» аказаліся кампазіцыйна неапраўданымі, немаштабнымі ў адносінах да ансамбля Крамля, што выклікала іх справядлівую крытыку архітэктурнай грамадскасцю. Наўрад ці ўдалае аблічча Новага Арбата, дзе элементы «амерыканізма» дысаніруюць з абліччам Крамля. З прыведзеных прыкладаў ясна, наколькі адказная, сур'ёзная праблема пераймальнасці і наватарства.

Гэтая праблема надзённая і для беларускага горадабудаўніцтва. Тым больш, што па волі лёсу шмат помнікаў дойлідства ў рэспубліцы загінула.

Возьмем Мінск. Паколькі ўжо склалася планіроўка горада, наўрад ці магчыма захаваць Нямігу, па напрамку якой павінен прайсці памянёны вышэй дублёр Ленінскага праспекта. Разам з тым варта падбаць, каб у гэтым раёне старога горада захаваць там-сям комплекс старой забудовы. На наш погляд, мэтазгодна, напрыклад, захаваць забудову вуліцы Астроўскага на адрэзку ад Нямігі да Хлебнага завулка. Цяпер архітэктары Мінскпраекта і Белдзяржпраекта, працуючы над конкурснымі праектамі забудовы цэнтра, павінны ўнесці адпаведныя прапановы.

Можна з упэўненасцю сказаць, што створаны за пасляваенныя гады цэнтральны ансамбль горада ўздоўж Ленінскага праспекта мае немалую мастацкую каштоўнасць і ўжо з'яўляецца сведчаннем гераічнага працоўнага подзвігу народа, які аднавіў з руін сваю сталіцу. І вельмі слушна, што гэты ансамбль (аўтары архітэктары Г. Баданаў, М. Баршч, С. Баткоўскі, У. Кароль, С. Мусінскі, М. Асмалоўскі, І. Рудэнка, Г. Сысоеў, Н. Трахтэнберг, Н. Шпігельман) прадстаўлены цяпер на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР.

□ □ □

Зразумела, у кожным беларускім горадзе пытанні рэканструкцыі і развіцця цэнтра трэба вырашаць творча, адпаведна канкрэтнай сітуацыі, крытычна скарыстоўваючы вопыт рэканструкцыі гарадоў у нашай краіне і за яе межамі. У гэтым пытанні, як і ў іншых, неабходна, каб творчыя праблемы актыўна абмяркоўваліся не толькі дойлідамі, але і самай шырокай грамадскасцю. Мэтазгодна правесці пашыраны пленум Саюза архітэктараў БССР, спецыяльна прысвечаны праблеме забудовы цэнтраў. Добра было б, калі б у гэтым пленуме прынялі ўдзел разам з дойлідамі мастакі, скульптары, гісторыкі, партыйныя і савецкія кіраўнікі буйнейшых гарадоў рэспублікі. Такі пленум мог бы з'явіцца і своеасаблівым семінарам горадабудаўнікоў, тых, хто практычна вырашае лёс забудовы нашых гарадоў.

Праблемы рэканструкцыі, забудовы цэнтраў гарадоў — справа дзяржаўнай важнасці. Яна патрабуе ўвагі шырокай грамадскасці, пастаяннага зацікаўленага клопату нашых творчых арганізацый.

Я. ЗАСЛАЎСКІ,
кандыдат архітэктуры, намеснік галоўнага архітэктара Мінска.



Паркавая магістраль з цягам часу будзе адной з прыгажэйшых вуліц Мінска. На здымку вы бачыце макет праекта забудовы Паркавай магістралі, распрацаваны архітэктарамі «Белдзяржпраекта» Я. Бенядзінтавым, У. Начаравым, Б. Духанам, А. Красоўскім.

ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПРЭМІІ БССР

АБМЯРКОЎВАЕМ ВЫЛУЧАНЫЯ ТВОРЫ

МЕСЦА Ў ЖЫЦЦІ

Я даўно люблю прозу Івана Чыгрынава. Увага пісьменніка звычайна засяроджана на ўнутраным жыцці людзей, якім выпалі нялёгкія выпрабаванні. Пісьменніка хвалююць праблемы шчасця людскога, праблемы сэнсу жыцця, воінскага і працоўнага гераізму. Гэта ж можна сказаць і пра кнігу яго апавяданняў «Самы шчаслівы чалавек», якая вылучана на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР.

Героі многіх апавяданняў з гэтай кнігі — людзі з нялёгкім, няпростым лёсам. Па-рознаму сустракаюць яны жыццёвыя выпрабаванні. Адны — як былы нарком Аляксей Васільевіч («Народны камісар»), брыгадзір бетоншчыкаў Іван Галкоўскі («Плывун») — не скараюцца лёсу і, не губляючы сваёй чалавечай годнасці нават у самых суровых абставінах, перамагаюць нягоды, іншыя — як Андрэй Хрупак («Дзічка») і Антон Ягоравіч («На пыльнай дарозе») — перастаюць быць гаспадарамі свайго лёсу, і іх жыццё здаецца нікчэмным і марным. А некаторыя яшчэ толькі шукаюць сваё месца ў жыцці.

Ціхамір з апавядання «Чайкі на хвалях» яшчэ не зрабіў, уласна кажучы, нічога ні добрага, ні благога. Ён — малады спецыяліст, які прыехаў з горада ў родныя мясціны, каб наведаць сваякоў і сяброў дзяцінства. І вось, пабыўшы ў сваёй вёсцы, ён думае, ці не застацца тут, між людзей, да якіх даўно прырос душою. Тут, у вёсцы, ён быў бы патрэбен больш, чым на гарадской сваёй рабоце, тут, пэўна, ён прынёс бы большую карысць. Ціхамір вагаецца і пакуль што не прымае пэўнага рашэння. Але нешта, што раней спала ў ягонай душы, абуджаецца пасля гэтай паездкі, у яго нібы раскрыліся вочы на свет: ён іначай бачыць і ўспрымае жыццё, радуецца навакольнаму хараству, якога раней не заўважаў. Усё, што ён чуе і бачыць у дарозе, — гаворкі людзей, песні, чайкі на хвалях, — горнецца да аднаго настрою, аднаго жадання. «Голас спевака і клікаў да сонца і тым жа часам раіў вярнуцца дамоў...І Ціхаміру раптам радасна врабілася ад тае думкі, што ў чалавека ёсць дом і што заўсёды можна вярнуцца туды».

І душэўная перамена, якая адбылася з Ціхамірам, скажацца, несумненна, на ўсім яго далейшым жыцці...

У кнізе «Самы шчаслівы чалавек» мне запомніліся і многія іншыя апавяданні: «Усціння», «За сто кіламетраў на абед...», «Трэція пеўні»... І тут аб'ектам увагі пісьменніка з'яўляецца ўнутранае жыццё чалавека, яго духоўны свет. І. Чыгрынаў з грамадзянскай страснасцю выкрывае ў сваіх апавяданнях правы поплаці, прыстасаванства, крывадушша і змагаецца за высакароднасць, душэўную чысціню, грамадскую актыўнасць.

Напісаныя жыццёва праўдзіва і па-мастацку пераканаўча, яго творы кранаюць чытачоў.

Ул. МАНГІНОВІЧ,
карэктар друкарні «Перамога».
г. Маладзечна.

НАРЫСЫ, ЯКІЯ ЧЫТАЧ ЗАЎВАЖЫЎ

Сярод мноства нарысаў, якія друкуюцца на старонках перыядычнага друку, нарысы С. Кухарава чытач заўважыў ужо даўно.

Мне здаецца, любімымі героямі аўтара з'яўляюцца маладыя людзі. Сапраўды, ім прысвечана большасць яго нарысаў. Гэта і выпускнікі школ, і маладыя рабочыя, і студэнты...

С. Кухараў не ўнікае праблем, не згладжвае цяжкасці, якія даводзіцца пераадольваць юнакам. І, разам з тым, усе яго нарысы вельмі аптымістычныя, яны пяюць гімн чалавечаму хараству.

Кнігі С. Кухарава ўзбагачаюць чытача жыццёвым вопытам, вучаць не пасаваць перад цяжкасцямі, дапамагаюць знайсці сваё месца ў жыцці.

Е. ІВАНОВІЧ,
журналіст.

РОДНАЕ

Край мой беларускі, край!
Дай мне прыгарнуцца, дай!
Да твайго лясного
Вераснога долу.
Дзе так шчасця многа
Выпала на долю.—
Дай жа прыгарнуцца, дай!

Радкі гэтыя з кнігі Ніла Гілевіча «Перазовы». Хочацца верыць, што так мог напісаць толькі паэт, які беззапаветна любіць родную зямлю і родны народ, якому блізка і дорага ўсё: і «знаёмы да болю дарагі краявід», і шум «верхавін у бары», і песні, што назаўсёды «ў сэрца запалі».

Мусіць, гэтая любоў падказала паэту тыя простыя, шчырыя, і разам з тым пякучыя і хвалюючыя словы і радкі, з якіх складаюцца вершы цыкла «Гарыць, гарыць мая Лагойшчына». Вершы гэтага цыкла, на маю думку, лепшыя ў кнізе. У іх—незгаснай боль паэта, горкі ўспамін аб жахах і трагедыях мінулай вайны. І «Балада пра паслухмяную Гэлю», і «Балада пра чырвоны каснічок», і «Балада колішняй вуліцы» па-сапраўднаму кранаюць і хвалююць. Тут кожнае слова напоўнена вялікім гневам, пракляццем, пратэстам супраць вайны, супраць яе падпальшчыкаў.

Я рады, што сярод твораў, якія вылучаны на атрыманне Дзяржаўных прэмій БССР, ёсць і кніга Н. Гілевіча «Перазовы».

Ул. ВЕСЯЛУХА,
загадчык Старадзьвяткавіцкага сельскага клуба Слонімскага раёна.

«ЛІТАРАТУРА—ГЭТА ХРАМ...»

ДА 90-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ С. Г. ШАУМЯНА



Сцяпан Георгіевіч Шаумян быў не толькі выдатным партыйным і дзяржаўным дзеячом, не толькі буйнейшым тэарэтыкам марксізма, але і таленавітым публіцыстам-літаратарам ленінскай школы.

С. Шаумян пакінуў багатую літаратурную спадчыну. Значнае месца ў гэтай спадчыне займаюць працы па пытаннях літаратуры і мастацтва.

Перад намі ляжаць два зборнікі твораў С. Шаумяна: «Аб літаратуры» і «Літаратурна-крытычныя артыкулы». У гэтых зборніках сабраны такія артыкулы С. Шаумяна, як «З выпадку шанавання памяці Л. М. Талстога», «Сёетое аб рэлігіі Л. М. Талстога», «Пра Горкага», «Пра Караленку», «Пра Чэхава», «Пра Верасаева», «Пра Бялінскага», «Пра рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў», «Пра зборнік армянскай літаратуры» і многія іншыя. Гэтыя артыкулы С. Шаумяна — яркая старонка з гісторыі марксісцка-ленінскай літаратурнай думкі.

Асноўным прынцыпам пралетарскай літаратуры і мастацтва С. Шаумян лічыў прамую, свядомую і адкрытую абарону інтарэсаў працоўных. Толькі глыбіня светапогляду, ідэйная яснасць, імкненне памагчы народу ў яго вялікім подзвігу, аддаць яму ўсю цеплыню душы дае сапраўднаму мастаку магчымасць ісці наперад і наперад, стаць праўдзівым песняром сваёй эпохі, свайго народа. Першае пытанне, якое ўзнікае пры ацэнцы творчасці мастака, заключаецца ў высвятленні таго, «у што ён верыў, перад якімі святынямі схіляўся ў сваім жыцці і якой практычнай грамадскай праграмай кіраваўся».

Мастацтва ў буржуазным грамадстве, падкрэсліваў Шаумян, носіць прадпрымальніцкі, гандлярскі характар, яно стала сродкам нажывы і спекуляцыі. Пісьменнікі служаць таму, хто плоціць. У сувязі з гэтым Шаумян пісаў: «Літаратура — гэта храм, куды можна ўваходзіць толькі з чыстым сумленнем, высакароднымі мэтамі. Калі ж людзі падыходзяць да гэтага храма з дробнымі славалюбнымі памкненнямі, хцівымі мэтамі і са схільнасцю да ілжы — гэта найвялікшае злачынства, якое чыніцца супраць народа».

Гэтыя думкі Шаумяна і сёння гучаць надзённа і актуальна.

С. Шаумян як прадстаўнік рэвалюцыйнага марксізма з усёй сілай і рэвалюцыйнай страснасцю паказвае велізарную ролю перадавога светапогляду ў творчай дзейнасці мастака. Адлюстроўваючы рэчаіснасць, пісьменнік ставіць перад сабой тыя ці іншыя грамадскія мэты, растлумачвае, асэнсоўвае, ацэньвае падзеі з тых ці іншых пэўных ідэйных пазіцый. А каб глыбока разабрацца ў заканамернасцях грамадскага развіцця, мастак павінен мець цвёрдую і стройную сістэму поглядаў, павінен валодаць навуковым светапоглядам і быць гатовым змагацца за свае ідэалы.

Вялікае значэнне для разумення літаратурна-крытычных поглядаў Шаумяна маюць яго артыкулы пра Л. М. Талстога. У іх дадзены глыбокі аналіз поглядаў і творчасці вялікага рускага пісьменніка ў цеснай сувязі з тымі гістарычнымі ўмовамі, у якіх ён жыў і працаваў. У сувязі са смерцю Л. М. Талстога Шаумян пісаў: «У асобе Талстога свет страціў сапраўды геніяльнага мастака, знаўцу чалавечай душы, стваральніка «Вайны і міру», «Анны Карэнінай», «Уваскрэсення»... і іншых мастацкіх твораў, высакародны і ачышчальны ўплыў якіх адчулі на сабе мільёны людзей».

Гэтыя артыкулы С. Шаумяна напісаны ў духу ленінскіх артыкулаў пра Льва Талстога.

З вялікай павагай і любоўю адносіўся С. Шаумян да творчасці М. Горкага. У 1911 годзе ён напісаў артыкул «Пра Горкага», а ў 1916 — «Пра аўтабіяграфічныя аповесці Горкага». У гэтых артыкулах С. Шаумян дае Горкаму высокую ацэнку як найвялікшаму пісьменніку пралетарыята, «любімцу рускіх рабочых». «Горкі, — пісаў ён, — сцяганосец чыстых інтэрнацыянальных пачуццяў і імкненняў». Вось чаму Горкі «ўвасабляе красу і гордасць пралетарскай рэвалюцыі», вось чаму «кожны радок Горкага чытаецца з вялікай эстэтычнай асалодай і цікавасцю». Заключаючы свой аналіз творчасці Горкага, С. Шаумян пісаў: «...і рабочыя з гонарам могуць заявіць: Так, Горкі наш. Ён наш мастак, наш сябра і паплечнік у вялікай барацьбе за вызваленне працы!».

З вялікай цікавасцю вывучаў С. Шаумян творчасць А. П. Чэхава. У сваім пісьме да жонкі ён раіць ёй: «Калі хочаш адпачыць і пасмяяцца—вазьмі Чэхава. Яго маленькія апавяданні надзвычай дасціпныя, вясёлыя і ў той жа час мастацкія». Ён асабліва адзначае «цудоўную мову» апавяданняў Чэхава.

Выдатным прыкладам беззапаветнага служэння народу лічыў Шаумян дзейнасць вялікіх рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў Бялінскага, Герцэна, Дабралюбава, Пісарава, Чарнышэўскага. Пра іх ён пісаў: «Іх маральная мужнасць, ідэйная перакананасць, глыбокая адданасць сваім вызваленчым ідэалам былі крыніцай таго, што яны пісалі не тое, што ім дазвалялі б надрукаваць, а пісалі тое, што дыктавалася ўнутранай патрэбнасцю пісаць, чаго яны не маглі не напісаць».

С. Шаумяну належыць значная заслуга ў нараджэнні і развіцці армянскай пралетарскай літаратуры і армянскай марксісцка-ленінскай літаратурнай крытыкі. З асаблівай любоўю і цеплынёй, з глыбокім веданнем пісаў ён аб прадстаўніках перадавой армянскай культуры і літаратуры. Ім быў напісаны спецыяльны артыкул «Пра зборнік армянскай літаратуры», выдадзены пад рэдакцыяй Горкага ў 1916 годзе.

Змястоўны артыкул напісаў С. Шаумян пра заснавальніка армянскай пралетарскай паэзіі Акопа Акапяна. Для рабочых, пісаў ён, «Акоп Акапян —прызнаны паэт. Ён з'яўляецца выразнікам нягод і радасцей гэтых рабочых, песняром іх працы і барацьбы».

...Паслязаўтра, 13 кастрычніка, спаўняецца 90 гадоў з дня нараджэння Сцяпана Георгіевіча Шаумяна. З гэтай нагоды хацелася сказаць пра яго некалькі слоў. Ён быў верным вучнем і саратнікам Уладзіміра Ільіча Леніна. Усю сваю рэвалюцыйную энергію, усё сваё свядомае жыццё С. Шаумян аддаў справе вызвалення пралетарыята, справе перамогі сацыялістычнай рэвалюцыі, вялікай барацьбе за камунізм.

Сурэн АЗДУНІ,
загадчык кафедры філасофіі і навуковага камунізма Віцебскага ветэрынарнага інстытута, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт.

З Нікалоза Бараташвілі

Цяпер, калі ўся наша краіна святкуе 150-годдзе з дня нараджэння выдатнага грузінскага паэта Нікалоза Бараташвілі, мы зноў перачытваем яго натхнёныя творы, прасякнутыя ідэямі свабодалюбства і гуманізму. Мне захацелася, каб вершы вялікага сына Грузіі загучалі і на нашай роднай мове. Прапаную ўвазе чытачоў «Літаратуры і мастацтва» два вершы Нікалоза Бараташвілі ў маіх перакладах.

Перакладчык

САМОТНАЯ ДУША

Зусім не шкода мне сірот
без даху:
Ім што! Для іх адкрыты ўсе
шляхі.
А вось з душой сірочай,
поўнай жаху,
Няма куды падацца ў час ліхі.

Хто аўдавеў,—яшчасны не
на векі,
Яшчэ ён знойдзе новых
свякоў,
А той, хто больш не верыць
чалавеку,—
Пакрыўджаны на век з усіх
бакоў.

Чыё давер'е людзі ашукалі,
Той насцярожаным жыве,
чужым,
І як бы дзе яму ні патурані,
Сумненне будзе тлець заўсёды
ў ім.

Ён так і застанецца адзінокім;
Не толькі людзі, радасці,
што ў крок
За ім раней хадзілі, зараз
бокам
Яго мінаюць, згледзеўшы
здалёк.

■ ■ ■

Асенні вецер у садку маім
Расцінку кволую зламаў на
градцы,
І я ўжо не магу змірыцца
з тым,
І сумным думкам змушаны
паддацца.

Не ў гэтым справа, што
збяднеў садок,
Мяне сягоння ўзрушыла
другое:
Што восені пачуў я побач крок
І шорах адцвітання пад нагою.

Пераклаў з грузінскай мовы
Пятро БІТЭЛЬ.

ВЫЙШЛІ З ДРУКУ

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Альбом **«Узняты з руін».** Аўтар тэксту і складальнік Анатоль Вялюгін. Фатаграфіі А. і М. Ананьіных. В. Бараноўскага, Ю. Іванова, Ул. Крука, М. Самахвалава. На беларускай, рускай і англійскай мовах. 1968 г. Тыраж 40.000 экз. Цана 3 руб. 4 кап.

Альбом **«Магілёў».** Тэкст і складанне П. Шасперыкова. Фатаграфіі В. Дубінкі. Афармленне У. Змітровіча. На беларускай і рускай мовах. 1968 г. Тыраж 13.000 экз. Цана 41 кап.

Данута Бічэль-Загнетава. Перапёлка. Вершы. Мастакі Я. Жылін, В. Мягкоў. 1968 г. Тыраж 50.000 экз. 32. стар. Цана 12 кап.

Іван Бурсаў. Казкі з прыказкамі. Малюнкі Н. Паплаўскай. На рускай мове. 1968 г. Тыраж 430.000 экз. 48 стар. Цана 26 кап.

Пятро Васілеўскі. Твой заўтрашні дзень. П'есы. Мастак І. Андрыянаў. 1968 г. Тыраж 2.000 экз. 332 стар. Цана 72 кап.

Анатоль Вялюгін. Вецер з Волгі. Паэма. Мастак І. Давідовіч. 1968 г. Тыраж 14.000 экз. 128 стар. Цана 59 кап.

Мікола Гроднеў. Вясна была. Аповесць і апавяданні. Мастак Ю. Архіпаў. 1968 г. Тыраж 8.500 экз. 184 стар. Цана 22 кап.

Барыс Казанаў. Антонаўскія яблыкі. Апавяданні і аповесць. Мастак А. Кашкурэвіч. На рускай мове. 1968 г. Тыраж 15.000 экз. 80 стар. Цана 12 кап.

Мікалай Кругавых. Дзе не чакаюць цішыні. Раман. Мастак В. Шаранговіч. На рускай мове. 1968 г. Тыраж 100.000 экз. 304 стар. Цана 59 кап.

Максім Лужанін. Збор твораў у трох тамах. Том першы. Вершы. Мастак Ю. Зайцаў. 1968 г. Тыраж 6.500 экз. 480 стар. Цана 1 руб. 62 кап.

Міхась Лынькоў. Збор твораў у чатырох тамах. Том трэці. Векапомныя дні. Раман у чатырох кнігах. Кнігі трэцяя і чацвёртая. Мастак Ю. Зайцаў. 1968 г. Тыраж 10.000 экз. 688 стар. Цана 1 руб. 46 кап.

Міхась Машара. Сонца за кратамі. Раман-хроніка. Мастак І. Давідовіч. 1968 г. Тыраж 11.000 экз. 392 стар. Цана 94 кап.

Іван Новікаў. Тварам да небяспекі. Дакументальная аповесць. Мастак Ю. Пучынскі. 1968 г. Тыраж 20.000 экз. 352 стар. Цана 56 кап.

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

ДЭБЮТ ВЫПУСКНІКОЎ ТЭАТРАЛЬНА-МАСТАЦКАГА

У ГРОДЗЕНСКІМ абласным драматычным тэатры адбылася прэм'ера камедыі Я. Ялунера «Жахлівае становішча». Спектакль паставіў рэжысёр В. Скарабагатаў, аформіў мастак М. Апіона, музыку напісаў В. Бурскі.

Спектакль гэты маладзёжны, у ім заняты пераважна выпускнікі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута У. Машчанчук, У. Шмакаў, І. Гаркуша, Л. Кучарэнка і іншыя. Іграюць у спектаклі і старэйшыя анцёры Г. Панкрат, С. Храмцоў, М. Малахаў.

Фота А. ПЕРАХОДА (БЕЛТА).

РАМАН САБАЛЕНКА

Апавяданне

ЛЯСНЫ СТАГНАЎ

Давялося мне ламаць галаву: дзе адпачыць улетку? На поўдзень перада мною вароты былі зачынены: урач сказаў, каб і носу туды не паказваў. Можа б я і не паслухаўся яго, але ён увёў гэта ў вушы жонцы, а яна сказала, што на поўдзень я павінен забыць усе дарогі. А, вядома, калі жонка сказала, то яе трэба слухацца, інакш яна на галаве струн нагрызе.

— Ды што вам доўга думаць, бацюхна мой! Нашы Кірылічы быццам для вас створаны, — сказаў галоўны ўрач паліклінікі Зміцер Юльевіч. — Лес там змешаны. Акурат для вашых нерваў, для вашага сэрца. Балота там асушылі, хоць кацёся па ім. Клімат там мо сушэйшы, чым на поўдні. Санаторый пабудаваны па сучаснаму, з лоджыямі. Не выходзячы з дому можна грэцца на сонейку. Адно што рэчкі няма. Дык вам не дужа і ў ваду можна рынаць! Дык вы, бацюхна мой, не доўга і думайце. От сёння запоўнім картку, пазвоню ў курортнае бюро і гэтымі днямі шпарце туды. Будзеце, як у бога за пазухай.

Зміцер Юльевіч выпісаў мне курортную картку ў Кірылічы. На рабоце доўга не бавіліся: ведалі, што я хворы і стараліся памагчы. Дырэктар адразу падпісаў загад аб адпачынку, а мясцоў выпатрабаваў пуцёўку ў Кірылічы.

Як бы там ні было, я цяпер тут. Добра, што гэта не дужа далёка ад нашага горада. Праўда, чыгунка сюды не ідзе, але гадоў пяць ці колькі назад прабілі дарогу-асфальтаванку, якая не так далёка ідзе ад Кірыліцкага лесу. Ад яе адвялі вузейшы рукаў да санаторыя, і цяпер сюды хоць кацёся.

А месца тут людскае. Лес такі, што выносістыя елкі, здаецца, з небам гамоняць. І густы — не прадзярэпся. Ёсць у ім і беразняк, і асінік. Пракідаюцца нават дубы. Яны не такія прысадзістыя, як на радкалессі. Дубы тут стройныя. Вершалінамі лезуць увышыню да сонца. Мусіць, таму, што растуць у гушчары. І маладая падсада ў Кірыліцкім лесе аж лапушыцца.

Ад асфальтаванкі да Кірыліч кіламетры два ці тры па лесе. А там Кірыліцкі груд і санаторый, у які я прыехаў. Людзей тут не дужа многа. Мо якіх чалавек шэсцьдзесят ці семдзесят. Займаюць яны пакуль адзін корпус. Два іншыя яшчэ не скончаны. Непадалёк ад корпуса пастаўлены домікі-катэджы. Гэта, мабыць, для медыцынскага персаналу і розных там службаў. Збудавана ўжо і сталовая: даўжэзная аднапавярховая будыніна. Пакуль што адпачыншчыкі, ці як іх тут завуць — хворыя, не запаўняюць і палавіны яе. Астатняя плошча пустае. Не ведаю чаму, але я страшэнна не люблю пустой плошчы. Мне чамусьці здаецца, што яшчэ надаўна тут былі людзі і іх нехта вынішчыў. Мне іх станавілася шкада. Блажэў настрой і я хмурнеў.

Афармленне заняло не дужа многа часу. Праз колькі хвілін я сядзеў ужо за сталом і разглядаў людзей. Гэта цікавы занятак. От люблю я па аблічах, па паводзінах здагадвацца, што за яны. Але сёння чамусьці я ні на кім не мог спыніць увагу.

Раптам, калі я акурат на некага загледзеўся, над самым маім вухам прагучаў жаночы голас.

— А, от вы і прыехалі. А я вас чакала-чакала і думала, што не дачакаюся,—жартавала, быццам мая старая, незнаёмая жанчына. — Як той казаў: святое месца пустым не бывае. Давайце знаёміцца! — сядаючы за стол, жанчына падала мне руку.

— Сіберная Клаўдзія Пятроўна, — адрэкамендавалася яна і дадала: — Можаце зваць проста Клавай. Я не пакрыўджуся.

Я таксама назваўся і сказаў, нібы ў жарт:

— Прозвішча ў вас халаднаватае.

— Каго трэба, сагрэе, — сказала Сіберная і на момант пачырванела.

Я зірнуў больш пільна на жанчыну і толькі цяпер заўважыў яе ўжо немаладую прыгажосць. Яна яшчэ не вельмі распаўнела. На шчоках віднеліся невялічкія плямкі чырвані — акурат як тыя, што жанчыны самі сабе малююць. Трошкі кірпаты нос быў таксама прывабны. На загарэлым прыгожым твары жанчыны блукала зычлівая ўсмешка. Вялікія сінія вочы яе быццам прамяніліся.

Я глядзеў на Сіберную і мне чамусьці захацелася нешта прыемнае сказаць ёй. Нешта папытаць у яе. От бывае так, што з адным чалавекам пры першай сустрэчы хочацца гаварыць і гаварыць і заўсёды знойдзецца пра што, а з другім можаш быць гадамі знаёмы, а пры сустрэчы не ведаеш, за што язык зачапіць.

З Сібернаю мне хацелася пагаварыць. Я і за абедам бавіўся, каб не выскачыць першым з-за стала.

— Што вы ўвечары будзеце рабіць? — запыталася Сіберная.

— Не ведаю. От хачу трохі з наваколлем пазнаёміцца.

— То вазьміце мяне за гіда.

— А вы што, хіба тут што ведаеце?

— Трошачкі!

— Калі ласка.

Надвячорак быў — любата. Гарачае дзённае сонца забрыло ўжо за лес. І па зямлі слаўся прыемны халадок. З небасхілу напаўзала цёмная густая хмара. Пасля дзённай спёкі такое надвор'е было як паратунак. Хай бы мо нават і дождж прайшоў. Даўно яго ўжо не было, і ўсё навакол быццам прасіла ніць.

— Клаўдзія Пятроўна, а мо не пойдзем? Мабыць, дождж будзе? — спытаў я сваю спадарожніцу.

— Ніякага дажджу не будзе. Ім і не пахне,— упэўнена адказала Сіберная. — А калі і пройдзе, дык мы ж не цукровыя. Затое я вам нештачка пакажу. Вунь гэтаю дарожкаю пойдзем.

Я не ведаў, што Сіберная ў гэтым Кірыліцкім лесе, як дома. Не магла ж яна за які тыдзень, што адпачывае тут, вывучыць яго. «Эт, цягне мяне куды папала, абы цягнуць», думаў я, аднак тым часам ішоў спакваля за жанчынаю і чакаў, што яна мне пакажа.

Не вельмі далёка ад санаторыя, край невялічкай палянкі, якая зарасла мятліцаю ды рознымі лясными травамі, Сіберная спынілася, загадкава зірнула на мяне і спытала:

— Вы не ведаеце, што тут ёсць?

— Што? — кідаў я вачыма вакол і нідзе нічога не мог згледзець, што б затрымала маю ўвагу.

— А вунь гэта, бачыце? — паказала Сіберная на камель асіны-старадрэвіны.

Відно было, што дрэва ўжо дажывае свайго веку. Паападалі ўжо з яго струхнелыя галіны. А тыя, што яшчэ трымаліся, былі без лісця. Толькі самая вершалінка была яшчэ зялёная.

— Дрэва, як дрэва, — адказаў я. — Ды яшчэ горкая асіна.

— Каб жа дрэва, як дрэва. А то вунь зірніце. Вунь! Вунь! Пасярэдзіне — бачыце, дупельца. Вунь там, каля тых сукоў! — удакладняла Сіберная.

Вельмі ёй хацелася, мабыць, каб я ўгледзеў тое дупельца. Я папраўляў акуляры, прыглядаўся і нічога не мог угледзець. Між сукоў тое дупельца не вельмі і відно было. Ды хіба мала ў лесе дупельцаў! Шмат якія птушкі выводзяцца ў іх. Мосцяць там гнёзды, нясуць яйкі і выседжваюць іх. Мо і гэтае нейкая птушка аблюбавала сабе пад гняздо. Свае думкі я выказаў Сібернай.

— Аблюбаваць то аблюбавала. А якая? — мусіць, хацела жанчына, каб я здагадаўся.

— Не ведаю.

Сапраўды, я не дужа ведаю птушыныя звычкі і норавы. Ліха яго ведае, якія з птушак водзяцца ў дуплах.

— Вы, мабыць, у лесе, як сляпы і глухі ў гародзе.

— Не ведаю. Можа і так. У нашай вёсцы блізка лесу не было. Мне ніколі так не выпадала, каб пажыць у лесе.

— Хіба ў вайну вы не ў партызанах былі? — спытала Сіберная, ды так, быццам усе людзі павінны былі ваяваць у партызанах.

— У арміі. На фронце быў, — адказаў я.

— Не дзіва, што вы і лесу не ведаеце. І я калісь да вайны не вельмі яго ведала, — прызналася Сіберная. — А цяпер...

□ □ □

Было гэта на трэцім годзе вайны. Фашысты асабліва залютавалі. Яны ўжо нават у лясы патыкаліся — так партызаны ім чосу давалі. Збяруць сілу вялікую і пойдуць на прачоску лясоў і пералескаў. Калі партызаны бачылі, што ім нявыкрутка, яны падаваліся куды-небудзь у іншае месца і там пераседжвалі навалу. А часта падпускалі карнікаў да якое-небудзь пасткі і захлопвалі іх там, як рудых пацукоў. Аднак нам ніяк не выпадала лёгкадумна ставіцца да фашысцкіх намераў. Разведка і яшчэ раз разведка — вось што патрэбна было, каб ведаць іх.

Нашы людзі данеслі, што фашысты рыхтуюць напад на Кірыліцкі груд. Камандзір партызанскай брыгады Язерскі быў ужо стрэляны, і як толькі атрымаў звесткі, што фашысты рыхтуюць напад на наш груд — шыкуюць нават танкі, браневікі і гарматы, дык і прыняў меры.

Да нашага груда можна было падступіцца толькі тады, як летняе сонца добра высушвала балацявіны ды выжарыны. Ды і то трэ было добра ведаць дарогу. А калі хто яе не ведаў, мог патрапіць у самую дрыгву ды ў багну. Ведаючы такую залежнасць Кірыліцкага груда ад дарог, яго ізаляванасць ад навакольнага свету, партызаны на ім асталяваліся, як дома. Адным ім вядомымі дарогамі выходзілі яны на жалезку, якая была не вельмі блізка адгатуль. Пускалі там пад адхон цягнікі, потым палявалі на паліцэйскія гарнізоны і вярталіся ў лагер без страт. Фашысты не маглі цярпець пад бокам такіх неспакойных суседзяў. Колькі разоў яны выступалі ўжо з намерам даць добрага пытлю партызанам. Але кожны раз даходзілі толькі да Марымонавай Рудні, дзе ў іх быў гарнізон, і адтуль вярталіся ў сваё стойбішча. Праўда, часцяком яны ўзнімалі вэрхал, крычалі што з Кірыліцкага груда і след партызанскі прастыў. Але праз нейкі час народныя мсціўцы давалі немцам знаць, што яны тут, што яны і не думалі куды ўцякаць.

Мясцоваму насельніцтву карнікі зычылі ўжо немалыя грошы, калі хто з тутэйшых правядзе іх на груд. Прайшла пагалоска, што знайшоўся нейкі паліцай-здраднік, які падмеўся вывесці карнікаў на груд. Дайшла яна і да партызанаў. Камбрыг Язерскі прыняў тэрміновыя меры, каб даць фашыстам па зубах, калі яны памкнуцца на груд: на ўсе дарогі і сцежкі, якія маглі прывесці карнікаў у лагер, былі пасланы засады. Яны загадзя добра ўмацаваліся і чакалі, калі паткнуцца фашысты. І ў лагеры былі прыняты меры: усю патрэбную маёмасць спакавалі і вызначылі, каму што браць на выпадак адступлення. Нездаляшчых старых і хворых эвакуіравалі ў «Зялёны бор» — калгас да вайны так зваўся. Было вызначана, куды і адыходзіць: на паўночны ўсход вяла не дужа шырокая прасека, якая цалявала на балота. Перад вайною «Зялёны бор» асушыў тое балота і туды ганяў на пасту жывёлу. Нават спрабавалі засваіць яго. Але на ваенных тапаграфічных картах яно значылася як непраходнае. Немцы не ведалі, што можна перайсці яго. Адно партызаны, сярод якіх было нямала мужчын з «Зялёнага бору», ведалі, што ў такое гарачае лета па ім можна не тое што прайсці пехатою, а нават праехаць з возам. Язерскі і меў на ўвазе дарогу тую, як запасную на выпадак, калі давядзецца адступаць. Зноў жа — па гэтай дарозе можна было ісці і на злучэнне з партызанскай брыгадай Ахрамца. Праўда, да яе было далекавата, але на ўсякі выпадак злучэнне з ёю мелася на ўвазе.

І на зялёнаборскую дарогу былі пасланы партызанскія дазорцы. Яны пільнавалі, каб немцы выпадкова не натрапілі на дарогу. Тады партызанам давялося б крута. Усё гэта было ўлічана і загадзя прадугледжана.

На світанку, калі яшчэ і не развіднела добра, у лагеры пачаўся рух. Жанчыны з дзецьмі, якія шукалі тут ратунку ад карнікаў, сядзелі, як на гарачым вуголлі—кожную хвіліну яны гатовы былі падняцца ў нялёгкую дарогу. Старыя мужчыны, хворыя і параненыя, якіх нельга было падпускаць да строю, складалі ў лагеры так званы гаспадарчы ўзвод. На гэты раз яны таксама былі пры зброі. Былы ляснік Станіслаў Мухаморац, які ведаў лес лепей чым свае пяць пальцаў, камандаваннем брыгады быў пакінуты за старшага. На ўсе дарогі і сцежкі ён павыстаўляў дазорцаў з нестраявых. Клаву Сіберную ён павёў сам сцежкаю праз лес. Гонкія елкі, перастаркі-асіны, маладыя дубкі і бярозы, якія ў гушчары леглі вершалінамі да сонца, спакойна шумелі лістотаю. Асабліва асіны. Дрыготкім лісцем яны, здавалася, перагукваліся адна з адною. Дрэвы, іх таямнічы шум навявалі на Сіберную нейкі дрыготкі настрой. След у след ідучы за Мухаморцам, яна нібы хавалася за яго шырокай спіною. Клава сама не ведала, чаго яна чакала, чаго баялася. Мо ёй станавілася сумна, боязна, што от неўзабаве яна зусім адна застанецца сярод ляснога зялёнага шуму?

Станіслаў Мухаморац распарадзіўся, што трэба глядзець, пільнаваць Клаве, і сам пайшоў да другіх. Клава мацней прыціснула пад пахаю нямецкі аўтамат. Пералічыла ражкі з патронамі. Іх было аж чатыры. Дзяўчына сама сабе сказала: патронаў хопіць, ніякаму чорту не здамся. Мухаморац ужо на хаду сказаў ёй:

— От тут вы і будзеце глядзець. Глядзіце, каб па гэтай сцежцы і мыш нават не пратачыліся.

Мухаморац бачыў, што боязь скаланае дзяўчыну. Хацеў нечым супакоіць яе хоць трохі. Спыніўся непадалёк, зірнуў на яе і сказаў:

— Ды вы не бойцеся. У вас жа ў руках аўтамат. Мо страляць не ўмееце?

— Страляю добра,—адказала Клава.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

З дванаццаці год пачаў ён захапляцца мастацкай разьбой па дрэву. Мясцовыя чарнаўнікі адразу ж скемілі, як можна скарыстаць умельства вясковага хлопчыка, і забаранілі яму ўсе адвольныя сюжэты, акрамя біблейскіх.

Здольнасці Барыса Міхеевіча Хрушчова па-сапраўднаму выявіліся толькі пасля Вялікага Кастрычніка. Ужо ў 1930 годзе разьбяр закончыў статую У. І. Леніна на поўны рост, якая затым экспанавалася на першай рэспубліканскай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Мінску. А ў 1937 годзе стварыў новы твор—партрэт А. С. Пушкіна. Гэтая работа таксама не засталася па-за ўвагай. Неўзабаве яна экспануецца на Усесаюзнай выстаўцы ў Маскве.

У час Айчыннай вайны Барыс Міхеевіч быў партызанскім сувязным. І таму яго многія пасляваенныя работы адлюстроўваюць жыццё і быт народных мсціўцаў.

Барысу Міхеевічу скора споўніцца семдзесят. Але ён па-ранейшаму поўны творчых задум, рукі яго па-ранейшаму ўпэўнена трымаюць разец.

Сваю апошнюю работу «Хадані ў У. І. Леніна» народны ўмелец прысвячае 50-годдзю БССР і КПБ. Зараз ён працуе над вобразам касманаўта У. Камарова.

Фота В. САВІЧА.

АД БЕТХОВЕНА ДА ПРАКОФ'ЕВА

Эміль Гілельс.

Незвычайным быў пачатак чарговага сімфанічнага канцэрта «Фестывалю лаўрэатаў міжнародных і ўсесаюзных конкурсаў». Прафесар Ленінградскай кансерваторыі Мікалай Сямёнавіч Рабіновіч быў у той дзень імяніннікам — і артысты Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра БССР, якія не раз і з поспехам выступалі з гэтым масцітым дырыжорам, адным з буйнейшых знаўцаў сімфанічнай музыкі і дырыжорскага мастацтва, паднеслі юбіляру пад апладысменты залы адрас, падарункі і кветкі.

А госць з Ленінграда зрабіў нам, у сваю чаргу, прыемны падарунак: выканаў Чацвёртую сімфонію Роберта Шумана, якая прагучала ў Мінску ўпершыню. Упершыню... Ці не дзіўна, што гэта гаворыцца аб адным з выдатных твораў заходнееўрапейскага рамантычнага сімфанізму, створаным яшчэ ў 1841 годзе?

Выкананне сімфоній Шумана ўяўляе для дырыжора пэўную цяжкасць. Не сакрэт, што гэты кампазітар, надзелены яркай фантазіяй, сапраўдны наватар у многіх галінах музычнага мастацтва, не быў настолькі ж яркі і самабытны ў галіне аркестравага мыслення. Інструментоўка сімфанічных партытур Шумана, напоўненых неўвядальным музычным хараством, крыху цяжкаватая. Не выпадкова Чайкоўскі, прыхільнік творчасці Шумана, марыў аб тым, каб пераінструментаваць усе яго чатыры сімфоніі.

Патрабуецца сапраўдная дырыжорская мужнасць, высокае майстэрства і бездакорны густ, каб прымусіць партытуру сімфоніі Шумана загучаць ярка і пераканаўча. М. Рабіновіч здолеў гэта зрабіць. Чацвёртая сімфонія была выканана цэльна і завершана, з глыбокім пранікненнем у стыль і характар яе музычных вобразаў. Аркестр чула ішоў за дырыжорскай палачкай і гучаў вельмі зладжана.

Асабліва добра прагучалі другая і трэцяя часткі — летуценны «Раманс», дзе трэба адзначыць майстэрскае выкананне сольных партый габаістам Валерыем Фраловым і віяланчэлістам Барысам Скабло, і парывістае «Скерца».

У другім аддзяленні канцэрта лаўрэат Ленінскай прэміі Эміль Гілельс выканаў разам з сімфанічным аркестрам Другі канцэрт Іяганэса Брамса. Гэты манументальны твор, які, па сутнасці, з'яўляецца чатырохчастковай сімфоніяй з салірующым фартэпіяна, вызначаецца грандыёзнасцю маштабаў і сапраўды эпічным размахам. Лірычным старонкам канцэрта ўласцівы глыбіня і высакароднасць. Фартэпіянная фактура канцэрта вельмі складаная, у ёй багата віртуозных эпізодаў, буйнай акордавай тэхнікі. Але для выканання гэтага твора ад піяніста патрэбна, апрача дасканалага тэхнічнага майстэрства, уменне мысліць сапраўды па-сімфанічнаму. Вось гэтая якасць у высокай ступені ўласцівая Э. Гілельсу, гэта яго музычная стыхія. Выкананне Другога канцэрта Брамса, сведкамі якога мы былі, павінна быць па праву далучана да вышэйшых дасягненняў нашага праслаўленага артыста.

На наступны дзень Гілельс даў свой сольны канцэрт. Многа разоў выступаў піяніст у Мінску — і заўсёды цікавасць да яго канцэртаў вялікая. На гэты раз канцэртная зала філармоніі таксама не змагла змясціць усіх жадаючых; і добра зрабіла дырэкцыя філармоніі, што паставіла проста на сцэне дадатковыя рады крэслаў для публікі. Гэта надало канцэрту асаблівы каларыт святочнасці, прыўзнятасці, надзвычайнасці музычнай падзеі.

Шкада, што Гілельс не выканаў тых твораў, якія былі паабяцаны ў афішы. Мы ведаем, як бліскуча ён іграе «32 варыяцыі» Бетховена і Трэцюю санату Пракоф'ева і з нецярпеннем чакалі новай сустрэчы з гэтымі шэдэўрамі выканаўчага майстэрства. А Другая саната Вебера павінна была стаць для нас «навінкай музыкі XIX стагоддзя». Але добра, што праграма, прапанаваная піяністам узамен, аказалася не менш цікавай. У першым аддзяленні — дзве санаты Бетховена: № 8 («Патэтычная») і № 14 («Месячная»). Яны дасканала знаёмы кожнаму аматару музыкі, яны многа разоў гучалі ў выкананні самых розных піяністаў. Такая ўжо ўласцівасць музыкі: знаёмы твор слухаеш з асаблівай цікавасцю, тым больш у выкананні піяніста, надзеленага такой яркай індывідуальнасцю.

Санаты Бетховена Э. Гілельс сыграў з той дасканалай прастатой, якая прыходзіць да сталага майстра, што знаходзіцца ў росквіце творчасці. Калі ў гады пачатку піяністычнай дзейнасці Гілельс, іграючы «Патэтычную», крыху захапляўся маторнасцю музыкі першай часткі, дык зараз на першы план выступае патэтыка і драматызм.

Але вось з-пад пальцаў піяніста паліліся першыя арпеджыі «Месячнай», «панесліся раптам ціхія, важныя гукі нібы з нейкіх нябачаных душэўных глыбінь, здалёку, здалёку» (У. Стасаў) — і ўся зала падначалілася таямнічай магіі выканаўчага майстэрства. Дасканалыя вобразы, створаныя геніем, дасканала ўвасоблены адным з буйнейшых піяністаў сучаснасці. Высокая паэзія і глыбіня высакароднейшых пачуццяў першай часткі, прыгажосць і мяккая ўсмешка другой, высокі напал і нястрымны паток палымяных пачуццяў фіналу — усё гэта было перададзена Гілельсам з пакараючай сілай і пераканаўчасцю.

Цэльнасці праграмы першага аддзялення канцэрта піяніст супрацьставіў разнастайнасць другога. У дзвюх п'есах Морыса Равеля — «Павана» і «Ігра вады» — Гілельс прадстаў як мастак, палітра якога багатая найтанчэйшымі фарбамі.

Асаблівую цікавасць выклікала «Саната-ўспамін» Мікалая Метнера. І зноў пытанне: чаму творы гэтага выдатнага рускага кампазітара такія рэдкія на нашых афішах? Пра «Санату-ўспамін» А. Гальдэнвейзер пісаў: «Дух сапраўднай паэзіі і глыбокай унутранай значнасці робіць яе адным з самых выдатных дасягненняў творчасці Метнера». Эміль Гілельс «расказаў» нам «Санату-ўспамін» з нейкай трапяткой шчырасцю. Асабліва здзівілі апошнія такты апавядання, напоўненыя высокім смуткам успамінаў пра былое. Гэта было адным з вышэйшых дасягненняў піяніста ў справаздачным канцэрце.

І адразу — рэзкі кантраст: два ўрыўкі з оперы Пракоф'ева «Любоў да трох апельсінаў», у тым ліку славуты марш. Сталёвы рытм, спружынная магутнасць ігры, строгая логіка руху, вытрыманая з жалезнай паслядоўнасцю ад першага да апошняга гуку — усё гэта выклікала буру захаплення.

Два эцюды Шапэна, сыграныя «на біс», якія адразу напоўнілі залу чароўным водарам музыкі вялікага польскага генія, паставілі кропку ў гэтым цудоўным канцэрце.

Л. АЎЭРБАХ.

ВУЧАНЬ ВЕНЕЦЫЯНАВА, НАШ ЗЯМЛЯК

Да 150-годдзя з дня нараджэння С. ЗАРАНКІ

„Шлях, які ён пратаптаў, не застанецца бязлюдным, і глыбокая павага да натуры, якой прасякнуты яго творы, перадалася многім мастакам».

Так ацэньвала мастацкая крытыка Расіі 1850-х гадоў творчасць жывапісца Сяргея Канстанцінавіча Заранкі, які праславіў сваё імя выдатна напісанымі партрэтамі.

Раннія гады С. Заранкі звязаны з Беларуссю. Ён нарадзіўся ў кастрычніку 1818 года ў мястэчку Лядава Бабінавіцкага павета Магілёўскай вобласці ў сям'і прыгоннага селяніна. У сярэдзіне 1820-х гадоў бацька Заранкі, адкупіўшыся на волю, разам з сям'ёй пераехаў у Пецярбург.

Адным з першых настаўнікаў С. Заранкі быў вядомы рускі мастак А. Венецыянаў. Ён займаўся з ім у сябе ў майстэрні і памог яму стаць вольным слухачом Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў. У 1838 годзе Сяргей Канстанцінавіч за карціну «Від Троннай залы» атрымлівае званне вольнага мастака. Першай работай, якая прыцягнула да яго ўвагу грамадскасці, была карціна «Від залы Вучылішча правазнаўства з групамі настаўнікаў і выхаванцаў» (1840—1841). У 1843 годзе ён напісаў «Від знутры Марскога Нікольскага сабора», за які яму было прысвоена званне акадэміка.

Працуючы ў Пецярбургу, потым у Маскве, Заранка стварыў галерэю партрэтаў сваіх сучаснікаў. Многія з іх, прызнана сустрэтыя гледачамі і крытыкай, сталі дасягненнямі рускага жывапісу сярэдзіны XIX стагоддзя. Партрэтам Заранкі ўласціва рэалістычная дакладнасць, матэрыяльнасць пісьма. Нельга не ўспомніць такія яго работы, як партрэты мастака А. Венецыянава (першая палова 1840-х гадоў), М. Варанцовай (1851), вядомага калекцыянера Ф. Прянішнікава (1844), славутага опернага спевака А. Пятрова (1849) і інш.

Някрасаўскі «Современник» з вялікай пахвалой гаварыў аб партрэтах мастака гэтага перыяду: «Акрамя незвычайнага падабенства і аддзелкі, яны ўражваюць дзівоснай жывасцю... Работы С. Заранкі не ўступаюць работам Кіпрэнскага, Варнека і іншых лепшых нашых партрэтыстаў».

На акадэмічнай выстаўцы 1850 года Заранка прадставіў партрэт віцэ-прэзідэнта Акадэміі мастацтваў, скульптара і мастака Ф. Талстога (у Дзяржаўным мастацкім музеі БССР ёсць варыянт-паўтарэнне гэтага партрэта), за які мастак атрымаў званне прафесара.

У гэтым партрэце С. Заранка стварыў цэльны вобраз Ф. Талстога. У партрэце падкупляе натуральная пастава — чалавек не пазіруе перад мастаком, а нібы слухае субяседніка.

У свой час вядомы рускі крытык У. Стасаў пісаў пра гэты партрэт: «Сапраўдным шэдэўрам з'яўляецца партрэт Талстога, не толькі па цудоўнай перадачы бархату і собаля, але і па трапнай характарыстыцы ўсёй асобы арыгінала».

З часу напісання партрэта Ф. Талстога, прайшло больш як сто гадоў. І, гледзячы на яго, мы заўважаем, што ў ім вернасць натуры даведзена да такой ступені, што мы бачым перад сабой жывога чалавека. У рускім партрэтным жывапісу XIX стагоддзя гэты партрэт належыць да ліку лепшых.

Работы Заранкі горача віталі гледачы і крытыка, якая адзначала, што мастак «стварыў зусім новы род партрэтнага жывапісу, які можна назваць родам пластычнай рэчаіснасці». Колькасць асоб, якія звярталіся да Заранкі з заказамі, павялічвалася з кожным годам. Мастак зрабіўся адным з самых папулярных партрэтыстаў у Пецярбургу, а потым у Маскве. У 1850-я гады ён стварыў цікавыя партрэты А. Лесніковай, Ф. Літке, Н. Строганавай, мастака В. Пукірава, княгіні Трубяцкой (два апошнія знаходзяцца ў зборы Дзяржаўнага мастацкага музея БССР).

У маскоўскі перыяд жыцця С. Заранка займаўся педагагічнай дзейнасцю. Яго педагагічныя погляды знайшлі адлюстраванне ў шматлікіх рапартах і запісках, пададзеных мастаком савету Маскоўскага мастацкага таварыства. У 1856 годзе ён стаў старшым прафесарам жывапісу і інспектарам Маскоўскага вучылішча жывапісу і скульптуры. Развіваючы традыцыі Венецыянава, Заранка перабудаваў сістэму выкладання ў кірунку рэалізму. Ён аддаваў перавагу натуры як аб'екту адлюстравання перад гіпсамі або эстампамі, патрабаваў адначасова навучання жывапісу і малюнку, практычнага засваення перспектывы.

У якасці інспектара і прафесара Маскоўскага вучылішча Заранка пастаянна клапаціўся аб моладзі, якая з'язджалася з усіх канцоў Расіі і не мела за душой ні капейкі. Менавіта тады ў вучылішчы знайшлося месца і для вучняў з так званага Заходняга краю. Сярод іх былі ўраджэнцы Беларусі — Ф. Хадаровіч, В. Сляндзінскі і інш.

У Заранкі вучыліся такія вядомыя рускія мастакі, як В. Пяроў, Н. Неўраў, І. Пранішнікаў, В. Пукіраў і інш.

Дзейнасць С. Заранкі — адзін з яркіх прыкладаў культурных і мастацкіх сувязей беларускага народа з передавой рускай мастацкай культурай.

Б. ЗАХАРЭВІЧ.

ПАМЯЦІ ВЫДАТНАГА МАЙСТРА СЦЭНЫ

У Мінскім Доме мастацтваў адбыўся вечар, прысвечаны 90-годдзю з дня нараджэння буйнага майстра сцэны, драматурга, народнага артыста БССР, прафесара Еўсігнея Афінагенавіча Міровіча. У святочна ўпрыгожанай зале сабралася тэатральная грамадскасць, госці, аматары і прыхільнікі таленту Міровіча.

На сцэне—партрэт Е. Міровіча, жывыя кветкі.

З уступным словам да прысутных звярнулася народная артыстка СССР Л. Александроўская. Усхвалявана гучыць яе прамова. Яна нібы нанава перажывае далёкія і незабыўныя сустрэчы з Еўсігнеем Афінагенавічам.

Прысутныя мінутай маўчання засведчылі сваю любоў і пашану да вялікага мастака.

Адзін за другім выступаюць на вечары сябры, вучні, паслядоўнікі Е. Міровіча. Кожны з іх гаворыць аб сустрэчах, аб рабоце з гэтым чалавекам, незвычайным мастаком, які нямала зрабіў для развіцця беларускага нацыянальнага тэатра.

Міровіч па-сапраўднаму ведаў і любіў акцёра. Ён быў цудоўным настаўнікам моладзі. Пад яго кіраўніцтвам вырасла плеяда майстроў сцэны.

На вечары з успамінамі аб жыцці і творчасці Е. А. Міровіча выступілі драматургі Р. Кобец, Я. Рамановіч, народныя артысты СССР Л. Рахленка, З. Стома, народныя артысты БССР В. Галіна, З. Браварская, дацэнт тэатральна-мастацкага інстытута А. Бутакоў.

Апладысментамі сустрэлі прысутныя паведамленне аб тым, што адна з вуліц, на якой у апошнія гады жыў Е. Міровіч, будзе насіць яго імя.

Пасля ўрачыстай часткі акцёры тэатра імя Янкі Купалы паказалі ўрыўкі з п'ес Е. Міровіча.

Б. БРУСНІКАЎ.

КРЫМСКІЯ ВЕРШЫ ЯНКІ КУПАЛЫ

Пад такім загалоўкам ялцінская «Курортная газета» 4 кастрычніка г. г. змясціла артыкул, у якім расказвае аб знаходжанні Янкі Купалы ў Крыму.

«Янка Купала,—паведамляе газета,—многа разоў бываў у Крыму. Упершыню ён наведаў яго ў 1923 годзе. Сюды паэт прыязджаў не дзеля таго, каб палюбавацца прыгажосцю прыроды. Пасля перанесенай цяжкай аперацыі ўрачы настойліва раілі Івану Дамінікавічу выехаць да Чорнага мора.

Знаходзячыся ў Гаспры, паэт захапляўся прыродай гэтага цудоўнага кутка. У Гаспры да гэтага часу захаваліся векавыя дубы і ліпы, пад зялёнымі шатамі якіх, паводле расказаў старажылаў, Янка Купала праводзіў цэлыя гадзіны з паперай і алоўкам у руках. У прыватнасці, тут ён напісаў верш «Крым» і іншыя паэтычныя творы, у якіх апяваў прыгожыя Крымскія горы, цудоўную тутэйшую прыроду, мора».

С. СЯМЁНАЎ.

АБМЕННЫЯ КАНЦЭРТЫ

На сцэне Палаца культуры завода «Гомсельмаш» выступаюць не толькі свае артысты, але і іншыя самадзейныя творчыя калектывы.

Цёпла прынялі сельмашаўцы артыстаў-аматараў літоўскай фірмы «Нерыс», з калектывамі якой спабарнічаюць гамяльчане. У канцэрце прынялі ўдзел эстрадны аркестр, чытальнікі, спевакі, танцоры і іншыя выканаўцы. Мастацкі кіраўнік творчага калектыву, заслужаны артыст РСФСР А. Карантай пазнаёміў гамяльчан з музычна-літаратурнай кампазіцыяй па паэме А. Твардоўскага «Васіль Цёркін». Сваім літоўскім сябрам па мастацтву сельмашаўцы падарылі памятныя сувеніры.

Вялікую аўдыторыю сабраў канцэрт, з якім выступілі вакальная група жаночага хору, мужчынскі вакальны ансамбль, танцавальная група Палаца культуры шклозавода імя Ламаносава. Многа прыемных хвілін даставілі ілюзіяністы-аматары Валерый і Ніна Абель, спевакі Раіса Ганчарова, Віктар Петрусевіч, Генадзь Іваноў і іншыя.

Наведалі сельмашаўцаў і самадзейныя артысты Палаца культуры бытавога абслугоўвання. Яркі, змястоўны канцэрт працягваўся каля дзвюх гадзін. Асабліва паспяхова выступілі спявачкі сёстры Бандаровы, сёстры Пагарэлавы, выканаўца рускіх народных песень Соф'я Пісьменная і іншыя аматары самадзейнай сцэны.

У сваю чаргу ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці Палаца культуры завода «Гомсельмаш» выступілі з канцэртам перад шклозаводцамі, а зараз рыхтуюцца да паездкі да сваіх літоўскіх сяброў.

В. СЯМЁНАЎ.

ЧАТХАН ЗАГУЧАЎ СА СЦЭНЫ

Старажытны хакаскі народны інструмент чатхан з далёкіх часоў суправаджаў выступленне народных сказальнікаў, спевакоў. Аднак гучанне гэтага інструмента, пры ўсіх яго меладычных вартасцях, было разлічана на абмежаваную колькасць слухачоў.

Майстар вытворчага навучання Абаканскага палітэхнікума Аляксей Шулбаеў вырашыў рэканструяваць чатхан для сучаснай масавай аўдыторыі. Работа, якая працягвалася некалькі гадоў, увянчалася поспехам.

На хакаскім абласным злёце сказальнікаў новы інструмент — электрычны чатхан — знайшоў усеагульнае прызнанне. Усе сказіцелі суправаджалі свае выступленні ігрой на рэканструяваным чатхане.

Хакаскі навукова-даследчы інстытут гісторыі мовы, літаратуры і мастацтва выдаў вынаходцу дакумент, у якім адзначаюцца вартасці электрачатхана і рэкамендуецца яго масавая вытворчасць.

Жан КАЦАР,
карэспандэнт АДН.

Па той бок

РАЗБУРАЛЬНІКІ МАСТАЦТВА

«Апранутыя ў новыя касцюмы пяць мастакоў накінуліся адзін на аднаго і пачалі рваць сваё адзенне на шматкі. Гэта працягвалася да таго часу, пакуль яны не засталіся ў адмоцці, якое ў многіх месцах, ужо не прыкрывала цела».

«Мастачка Бічы Хендрыкс прынесла ў двор велізарны кавалак ільду і стала яго разбіваць кіркай і кулакамі, пакуль ледзяная глыба не раскалолася і з яе не выпалі падвянечнае плацце і туфлі».

Спынім тут цытаванне і паспрабуем угадаць — што ўсё гэта азначае? Бязвінныя трукацтвы распусных шалапаеў, якія стараюцца перамагчы адзін аднаго ў нечым «арыгінальным» і «ашаламляльным»? Або, можа, звычайныя трэніроўкі аматараў арыгінальнага жанру?

Не тое і не другое. Як ні дзіўна, але мы з вамі, можна сказаць, завочна прысутнічалі пры нараджэнні «шэдэўраў», створаных прадстаўнікамі плыні, якая атрымала назву «мастацтва разбурэння». Паслядоўнікі і прыхільнікі гэтай «школы» дэманстравалі публічна свой «талент», свае «здольнасці» з прычыны вельмі знамянальнай падзеі — адкрыцця ў Нью-Йорку, у коледжы Фінча, выстаўкі аднайменнай назвы — мастацтва разбурэння». Амерыканскі часопіс «Ньюсуік», які расказаў на сваіх старонках аб прыведзеных вышэй «мастацтвах», піша, што усе ўдзельнікі гэтых, па меншай меры, дзіўных сцэн належаць да «інтэрнацыянальнай групы мастакоў, куды ўваходзіць 40 чалавек з розных краін. Іх «творчы почырк» заключаецца ў асноўным толькі ў тым, каб разбураць. «Ньюсуік» указвае, што з гэтай мэтай яны часта патрашылі мэблю, палілі кнігі, а аднойчы, як піша часопіс, «зрабілі кактэйль з паўголай дзяўчыны, закідаўшы яе сырымі яйкамі» (?!).

Аднак было б няправільна думаць, што ўсе асобы, якія ўваходзяць у гэтую групу, працуюць на адзін манер. Зусім не так. У кожнага з іх свой, глыбока «індывідуальны» стыль. Так, напрыклад, Лючыо Фантана спачатку малюе на палатне, а потым тут жа рэжа яго на кавалкі. У Поля ван Хейдонка стыль іншы—ён трыбушыць манекены, разбірае старыя крэслы, а потым зноў усё збірае ў адно, але ўжо па свайму густу. Армана больш прыцягвае музыка, а дакладней — музычныя інструменты—скрыпкі і віяланчэлі, якія вылучаюцца, на яго думку, «дасканалай формай». Не доўга думаючы, ён шпурляе іх на падлогу, разбівае ўшчэнт, тлумачачы гэты варварскі акт тым, што «адна дасканалая форма нараджае другую». Ліл Пікард лічыць за лепшае маляваць агаленыя фігуры на гальштуках і на плаццях, а потым выпальвае на іх дзіркі. Тлумачачы сваё захапленне, яна гаворыць: «Вельмі многа мастакоў з псіхалагічнага пункту гледжання адарваны ад нашага грамадства. Мы павінны эмацыянальна быць звязаны з агіднасцямі і ствараць прыгажосць».

Можна бясконца пералічваць шматлікія праяўленні «мастацтва разбурэння». Да таго, што сказана, дададзім яшчэ наступнае. Энрыка Бадж займаецца тым, што б'е люстэркі. Жан Тош шырока выкарыстоўвае магутныя лямпы, якія асляпляюць гледачоў. Марці Грынбаум малюе і піша каракулі на кнігах, а Ладзіслаў Новак робіць свае малюнкі на рэпрадукцыях вядомых карцін.

І так, разнавіднасцей «мастацтва разбурэння» многа, але давайце звернемся не да асобных выкрутасаў той ці іншай асобы, якая называе сябе мастаком. Чым выклікана такая з'ява, як «мастацтва разбурэння»? Канечне, пра сапраўднае мастацтва тут не можа быць і гутаркі. Але ж нікуды не ўцячэш ад такога факта, што ёсць на Захадзе людзі, і, відаць, нярэдка таленавітыя, якія сваё прызванне бачаць у тым, каб разбураць, знішчаць, разбіваць. У чым справа? Якая ж філасофія гэтай «школы»?

На здымку, узятым з часопіса «Ньюсуік», вы бачыце адзін з момантаў стварэння «шэдэўра», пра які гаворыцца ў артыкуле.

Трэба сказаць, што ў адрозненне ад іншых, модных на Захадзе плыняў — «поп-арт», «кінетычнае мастацтва» і г. д., настолькі ж далёкіх ад сапраўднага мастацтва,— прыхільнікі «разбуральнага» стылю адрозніваюцца больш адкрытым выкладаннем свайго «творчага» крэда. Яны не гуляюць у кошкі-мышкі, а адкрыта, нават цынічна выкладаюць сваю «філасофію», свае ідэйныя крыніцы «натхнення». Вось, напрыклад, што гаворыць аб «мастацтве разбурэння» Ральф Ортыц. «Мастацтва разбурэння, — адкрыта гаворыць ён на старонках «Ньюсуіка», — гэта сімвалічнае мастацкае ўвасабленне ўсіх тых унутраных, прыхаваных, разбуральных непазбежных тэндэнцый, якія з самага пачатку існавання чалавецтва прывялі яго да крызісу. Усе мы па прыродзе нацысты, фашысты, забойцы, мы перапоўнены рашучасці ўсё падаўляць і ўсё ненавідзець. І вось замест таго, каб абрушваць нашу прыродную агрэсіўнасць на людзей, мы павінны выкарыстаць яе ў мастацкай форме ў прымяненні да аб'ектаў і жывёл».

Праграма, выкладзеная Ортыцам, гэта—не проста бясрыўдны маніфест людзей, ахопленых нясцерпным свербам крышыць, ламаць, душыць усё навокал. Гэта нешта большае. І адсюль невыпадкова Ортыц спакойна аперыруе такімі словамі, як «нацысты», «фашысты», «забойцы», спрабуючы прыпісаць людзям звярыныя інстынкты і звычкі.

Але дарэмна ён гаворыць за ўсіх і ўся. У стане крызісу знаходзіцца не ўся цывілізацыя, а грамадства, дзе даўно ўжо растаптаны светлыя ідэалы, дзе працвітае культ насілля і нажывы. Іменна ў гэтым асяроддзі і з'яўляюцца такія дзікія ненармальнасці, як «мастацтва разбурэння». Характэрна, што нават рэакцыйны амерыканскі часопіс «Ньюсуік», які расказаў аб «мастацкіх» выхадках Ортыца і кампаніі, прасочвае сувязь паміж мастакамі — «разбуральнікамі» і тым грамадствам, дзе яны жывуць. «Мастакі мастацтва разбурэння,—піша часопіс, — відаць, настойваюць, што мастацтва, падобна на жыццё, не вечнае. Усё ўрэшце-рэшт будзе знішчана, хутчэй або павольней, раней або пазней. Па сутнасці, гэтыя мастакі адлюстроўваюць жыццё грамадства, дзе разбурэнне з'яўляецца звычайнай справай — бомбы, галадаючыя мільёны людзей, аўтамабільныя катастрофы, паўстанні ў гета».

Што правільна, то правільна. «Мастацтва разбурэння» нарадзілася не на пустым месцы. Яго нальскай з'яўляецца капіталістычны лад, у якім насілле ў самых разнастайных праяўленнях даўно ўжо стала нормай жыцця.

Г. НАВІЦКІ.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

11 кастрычніка

Першая праграма. 9-30 — тэлебачанне — школе. Гісторыя. 10-ы клас. «Бітва за Беларусь». 10-05 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Чароўны лук». Мультыплікацыйны фільм (М). 10-30 — «На палях краіны». (Уключэнне Мінска) (М). 11-00 — Ст. Лем. «Салярыс». Тэлевізійны спектакль. Частка другая (М). 16-55 — «Навіны». 17-05 — праграма перадач. 17-10 — фестываль дакументальных фільмаў, прысвечаны 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. «Першы залп». 17-20 — да 50-годдзя ВЛКСМ. «50 ударных дзён». Тэлерэпартаж з Мінскага маторнага завода. 17-50 — для школьнікаў. «Жыццё выдатных людзей». Архімед. 18-20 — на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР. Графіка Арлена Кашкурэвіча. 18-50 — «5+2». Штотыднёвы агляд. 19-30 — першынство СССР па футболу. «Дынама» (Масква) — «Дынама» (Тбілісі) (М). 21-15 — «Эстафета навін» (М). 22-15 — музычная вясёлая праграма (М). 23-15 — тэлевізійныя навіны (М). 23-30 — «Танцавальная зала». Перадача з Таліна. 24-00 — «На сон надыходзячы». Музычная праграма.

Другая праграма. 17-05 — тэлевізійныя навіны (М). 17-15 — для малодшых школьнікаў. Да 50-годдзя ВЛКСМ. «Арляняты» (М). 18-00 — у эфіры — «Маладосць». «Вечны агонь» (М). 19-00 — старонкі музычнага календара (М). 19-15 — «Фізкультура і спорт» (М). 19-30 — канцэрт.

12 кастрычніка

Першая праграма. 8-25 — праграма перадач. 8-30 — для студэнтаў тэхнікумаў. «Дэталі машын». 9-00 — «Гімнастыка для ўсіх» (М). 9-45 — тэлевізійныя навіны (М). 10-00 — «З днём нараджэння!» (М). 10-30 — «Суботні рэпартаж». Перадача з г. Горкага. 11-00 — «Баявая садружнасць». Да 25-годдзя стварэння Войска Польскага. 11-20 — «Пра нашу і вашу свабоду». Дакументальны фільм. 12-50 — «Музычная шкатулка». 13-10 — тэлевізійны клуб «Колас». Да Усесаюзнага Дня работнікаў сельскай гаспадаркі. 14-00 — тэлевізійны тэатр для дзяцей. М. Святлоў. «Праз дваццаць год». Спектакль Цэнтральнага дзіцячага тэатра (М). 16-00 — «Свет сацыялізма» (М). 16-30 — праграма каляровага тэлебачання (М). 18-00 — першынство СССР па футболу. «Дынама» (Кіеў) — «Спартак» (Масква). Перадача з Кіева. У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 19-45 — «Клуб кінападарожнікаў» (М). 20-45 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-15 — «Гэта песні тваё, камсамол!» (М). 23-00 — канцэрт аркестра «Блакітны экран» (М). 23-30 — тэлевізійныя навіны (М).

Другая праграма. 11-00 — «Веды» (М). 11-45 — «Мастацтва і мы». Тэлевізійны часопіс. Перадача з Тбілісі. 12-30 — «Здароўе» (М). 13-00 — у эфіры — «Маладосць» (М). 18-00 — «Тваё шчодрае сэрца». Дакументальны фільм. 19-10 — «Трохвугольнік». Мастацкі фільм. 20-30 — «Ленінградскі балет». Музычны фільм.

13 кастрычніка

Першая праграма. 8-25 — праграма перадач. 8-30 — для студэнтаў тэхнікумаў. «Тэарэтычная механіка». 9-00 — «На зарадку станавіся!» (М). 9-15 — тэлевізійныя навіны (М). 9-30 — «Будзільнік» (М). 10-00 — «Навіны дня». Кіначасопіс. 10-10 — для дзяцей. «Каджана». Мастацкі фільм. 11-20 — «З намі Ленін уперадзе». Да 10-годдзя сацыялістычнага спаборніцтва за званне «Брыгады камуністычнай працы». 12-10 — насустрач 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. «Беларускі рамонак». Тэлевізійная віктарына для школьнікаў. Другі тур. 12-40 — «Радзіма». Тэлевізійны маладзёжны клуб. 13-20 — для школьнікаў. Канцэрт. Перадача з Берліна. 14-00 — «Свята ўраджаю». Да Усесаюзнага Дня работнікаў сельскай гаспадаркі (М). 16-00 — «Музычны кіёск» (М). 16-30 — праграма каляровага тэлебачання (М). 18-00 — «На агеньчык». Перадача з Саратава. 19-00 — насустрач 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. «Чалавек зямлі маёй». Тэленарыс пра энергетыка Мінскага маторнага завода С. Шынко. 19-30 — Закрыццё фестывалю лаўрэатаў міжнародных і ўсесаюзных конкурсаў, прысвечанага 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. 22-30 — «Белыя і чорныя». Тэлевізійны шахматна-шашачны клуб.

Другая праграма. 10-10 — «Ізатопы ў прамысловасці». Рапартаж з усесаюзнай канферэнцыі «20 год выкарыстання ізатопаў і ядзерных выпраменьванняў у народнай гаспадарцы СССР». Трансляцыя на Маскву. 10-30 — «Помнікі архітэктуры» (М). 11-00 — для юнацтва. «Шукальнікі». Тэлевізійны клуб (М). 11-50 — для школьнікаў. «Сусветны следапыт». Перадача з Ленінграда. 12-20 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. Перадача з Калінінграда. 19-00 — канцэрт лаўрэатаў II Міжнароднага фестывалю эстраднай песні ў Сочы (М). У перапынку — «Сем дзён». Міжнародная праграма (М). 22-00 — у эфіры «Маладосць» «Гарызонт». Перадача з Ленінграда.

ЛЯСНЫ СТАГНАЧ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

— Ну то і добра!—сказаў Мухаморац і зірнуў на дзяўчыну гэтак, што ў тым позірку адчувалася і шкадаванне, і спачуванне ёй і тая балючая любасць, якая ніяк не магла праявіцца на ўсю сілу тут, у гэтым лесе, пры гэтых умовах.

— Ідзіце, дзядзька,—спалохалася Клава Мухаморцавага позірку.

— Які я табе дзядзька!—пакрыўджана буркнуў ляснік і, не развітаўшыся, пайшоў.

Клава зірнула яму ўслед. Спалохалася, што засталася адна. Нават пашкадавала, што гэтак неабачліва назвала Мухаморца старым. А ён мо нават і пакрыўдзіўся? Дзяўчына нервова захадзіла сюд-туд ўскрай палянкі, трымаючы аўтамат напагатове. Прыгледзелася, што ў густой траве значыцца сцежачка яе слядоў. Каб не гэтак цягнуўся час, дзяўчына пачала лічыць крокі. Налічыла пяць тысяч. Збілася і пачала нанава.

Тым часам па зямлі ўжо слаўся надвячорак. На палянку, на лес, нібы вялікі цёмны шацёр, спускаўся прыцемак. Лес і ўсё наваколле стала хмурным, здавалася, беспрасветным. У гушчыні лесу чулася запознанае дзятлава цюканне, быццам птушка старалася да начы абавязкова скончыць сваю работу. Каб дзяўчына бачыла, на якім дрэве цюкае дзяцел, яна б папусціла ў яго палкаю і прагнала. Нарэшце дзяцел перасціх. На лес апала не толькі летняя ноч, але і старожкая цішыня. Кожны Клавін крок, здавалася, адбіваўся ад мяккай травяной сцежкі гулам. Дзяўчына старалася гэтак ціха ступаць, каб пад нагамі нішто не шаснула.

А лес не маўчаў. Ён быў поўны нейкіх таямнічых гукаў, якіх Клава ніколі і не чула. І раптам нейчы стогн. Быццам чалавек памірае. Дзяўчына спалохана насцярожылася. Яна ўскінула аўтамат, стаілася пад камлём тоўстага дрэва. Страляць яна перадумала. Прыйшло ёй у галаву старое правіла: «не чапай бяду, дык і яна цябе не зачэпіць». Зноў жа—дасць яна чаргу, у лагеры падымецца вэрхал. Амаль да самага канца ночы прастаяла так Клава. Толькі пад раніцу, калі пачало праклёўвацца світанне, стогн прыціх, а потым і зусім змоўк. Пад нейчымі нагамі затрашчала ламачча. Клава кінулася з-пад камля і закрычала не сваім голасам:

— Стой! Хто ідзе?

— Гэта я. Свой! Не бойся,—азваўся Мухаморац.

У Клавы адлегла на душы. Яна глядзела на Мухаморца, як на свой ратунак.

— Страшна было?—спытаўся Мухаморац, бачачы апантаны Клавін выгляд.

— А як жа. Страшна. От тут блізенька нехта стагнаў ды стагнаў. Дык хіба не страшна! Мо які немец?

Мухаморац азадачана глядзеў на Клаву. Думаў, што ёй усё здалося. Аднак жа, узяўшы аўтамат напагатоў, ён пайшоў з дзяўчынай шукаць таго стагнача. Вось яны падышлі пад таўставатую, з парэпанаю карою асіну. Мухаморац прыпёрся плечуком да яе камля. Над галавою лясніка шугануў дзяцел. Клава таксама бачыла дзятла, але не магла зразумець, адкуль ён вылецеў. Мухаморац паглядзеў на дрэва, пастаяў, падумаў і сказаў упэўнена Клаве:

— Вунь ён паляцеў, той стагнач.

— Які стагнач?—не зразумела Клава.

— Той дзяцел, што вылецеў з дупла. Вунь ён у тым дупле сядзеў.

— У тым? — перапытала Клава, паказваючы пальцам на ледзь прыкметнае ў дрэве дупельца.

— Дзятлы ў дуплах выводзяцца. Гэта ж ён, небарака, так і стагнаў.

— Дык хіба птушкі стогнуць?

— Стогнуць, як і людзі, калі ім баліць,— адказаў Мухаморац.

— Дзіва!—сумелася Клава.

— Няма ніякага дзіва. Чула ж, пэўна, як ён цэлы дзень малаціў дзюбай па дрэвах? А яна ж не жалезная. Ды і галава ў птушкі не з жалеза. Дык от галава і забалела. За дзень ён настукаўся, а за ноч настагнаўся. Гэта з дзятламі бывае.

— А я і не ведала. Думала, што немец які стогне,—прызналася Клава.

— Пойдзем ужо ў лагер. Немцы паскакалі-паскакалі, дый назад папхнуліся. Хай бы паткнуліся. Мы б ім тут паказалі, дзе дзятлы стогнуць,—выказаў сваю ўпэўненасць Мухаморац.

□ □ □

Гэта было даўно. Цяпер і Кірыліцкі груд не той, што быў. Ужо нават нідзе і звання партызанскага лагера не засталося. Цяпер там санаторый «Крынічнае». І балота таго, што было калісь, няма. На грудзе цяпер людна. Штомесяц сюды наязджае поўна людзей. Не толькі з Беларусі. З самых далёкіх мясцін краіны едуць яны. Вада тут такая, што лепшая, як на Каўказе ці ў Трускаўцы.

Клаўдзія Пятроўна Сіберная прыехала ў санаторый, як дадому. Па стану здароўя ёй не вельмі і трэба піць тую ваду, якая б'е тут з-пад зямлі. Яна лечыцца тут паветрам, краскамі, травамі і яшчэ—успамінамі.

Мо яшчэ дзе і той дзяцел жыве, што напалохаў тады дзяўчыну! Асіна з тым дуплом вунь жа яшчэ стаіць. Многа голля на ёй усохла ўжо. Адно вершалінка, як маладая, трапечацца лісцем нават у ціхую пагоду.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, Р. С. БЯРОЗКІН, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск вул. Захарава 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25 адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 01994